

2013-ы вырашальны год для развіцця «лічбы» ў Беларусі. Сёння ўжо працуюць 64 перадаючыя станцыі, якія дазваляюць забяспечыць добры прыём лічбавага сігналу на тэрыторыі рэспублікі для прыкладна 95% насельніцтва.

СТАР. 2



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**30 КАНАЛАЎ**



У бліжэйшы час чакаецца рост сезоннай захваральнасці на грып і ВРВІ, таму ўрачы заклікаюць насельніцтва не ігнараваць меры прафілактыкі. Самай эфектыўнай мерай будзе ізаляцыя таго, хто ўжо захварэў.

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 СТУДЗЕНЯ 2013 г. ПЯТНІЦА № 5 (27370) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## КЛОПАТ АБ ПАЖЫЛЫХ ЛЮДЗЯХ І ДАЛЕЙ БУДЗЕ Ў ЛІКУ ПРЫЯРЫТЭТАЎ ДЗЯРЖАВЫ

**Аб гэтым заявіў учора Аляксандр Лукашэнка, наведваючы Рэспубліканскі інтэрнат ветэранаў вайны і працы, перадае БЕЛТА. Прэзідэнт таксама лічыць, што неабходна прыняць рашэнне па ўзмацненні адказнасці дзяцей за састарэлых бацькоў.**



Фота БЕЛТА.

«Трэба прымусіць дзяцей глядзець за сваімі старымі, а калі не хочуць — няхай за гэта плацяць», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Прэзідэнт даручыў вывучыць, як гэта пытанне адлюстравана ў заканадаўстве. «Калі не хапае заканадаўчай базы, то ў першым паўгоддзі трэба прыняць рашэнне. Дзеці павінны клапаціцца аб сваіх бацьках», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

Як далажыла кіраўніку дзяржавы міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна Шчоткіна, у Беларусі функцыянуе 22 інтэрнаты для ветэранаў вайны і працы. Грамадзянам, якія пражываюць у іх, ствараюцца хатнія ўмовы, прадастаўляецца паўнацэннае, разнастайнае харчаванне, адзенне, абутак, неабходнае бытавое абслугоўванне. Акрамя таго, тут арганізаваны кругласутачны догляд, аказваецца медыцынская дапамога. Адзінокія пажылыя грамадзяне, якія не маюць працаздольных членаў сям'і, абавязаных па закону іх утрымліваць, знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні. Пры наяўнасці працаздольных членаў сям'і пажылыя людзі селяцца ў дом-інтэрнат на платных умовах пры наяўнасці свабодных месцаў.

Што датычыцца Рэспубліканскага інтэрната ветэранаў вайны і працы, размешчанага ў Ждановічах, то цяпер тут пражываюць 166 чалавек. Як паведаміла міністр, ён разлічаны для пражывання тых людзей, хто ўнёс важкі ўклад у абарону краіны ў гады Вялікай Айчыннай вайны і яе развіцця ў мірны час. «Гэта адзіная такая ўстанова на прасторы СНД, і інтэрнат павінен захавацца для тых людзей, хто зрабіў максімум для краіны», — сказала міністр.

Аляксандр Лукашэнка падрабязна цікавіўся тым, якія праблемы існуюць у ветэранаў, якія тут пражываюць. Аднак і міністр, і дырэктар інтэрната, і самі пражываючыя запэўнілі кіраўніка дзяржавы, што створаны максімальна камфортныя ўмовы для жыцця. Першых жыхароў інтэрнат прыняў у 1974 годзе. Па даручэнні Прэзідэнта праведзена рэканструкцыя будынка, а ў 2011 годзе завершана будаўніцтва і ўвод у эксплуатацыю лячэбна-аздараўленчага корпуса.

Прэзідэнт азнаёміўся з умовамі пражывання ветэранаў вайны і працы ў інтэрнаце, агледзеў спартзалу, басейн, жылыя пакоі, бібліятэку, музей Вялікай Айчыннай вайны. Затым ветэраны запрасілі Аляксандра Лукашэнку на чаяпіцце.

Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што дзяржава і далей будзе рабіць усё магчымае для дастойнага жыцця пажылых людзей. «Я хачу, каб вы жылі, каб, гледзячы на вас, і іншыя жылі і цанілі жыццё», — сказаў Прэзідэнт.

Адна з жанчын, якія пражываюць у інтэрнаце, паскардзілася на тое, што ў краіне няма свята для партызан. «Не магу згадзіцца, што ў нашай краіне не ведаюць, хто такія партызаны і якую ролю яны адыгралі, — сказаў Прэзідэнт. — Ёсць людзі, якія спрабуюць сёння ачарніць партызанскі рух. Але ў нашай краіне мы не дазволілі ваш подзвіг сказіць». Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў гэтым годзе будзе завершана будаўніцтва музея Вялікай Айчыннай вайны, дзе будзе адлюстравана, у тым ліку, і роля партызан. «Гэта будзе велічны музей, мы яго зробім самым сучасным, пампезным, калі хочаце, каб людзі, якія прыязджаюць у Мінск, заходзячы ў гэты музей, разумелі, што зрабіў наш народ для таго, каб яны жылі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. «Заходняя Еўропа павінна памятаць і цаніць, што мы ім жыццё прынеслі сваёй стойкасцю, непахіснасцю», — сказаў Прэзідэнт.

Прэзідэнту на памяць аб наведванні інтэрната ветэраны падарылі 2 карціны: напісаную фарбамі і вышытую. Ветэраны таксама пажадалі кіраўніку дзяржавы больш адпачываць, паколькі, на іх думку, ён працуе на знос. «Вы нам патрэбны. Пакуль вы на чале ўлады, мы абсалютна спакойныя, што аб нас старых ёсць клопат», — сказала адна з жыхарак інтэрната. Ад кіраўніка дзяржавы ветэранам таксама быў зроблены падарунак — дамашні кінатэатр.

### АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА 15 СТУДЗЕНЯ ПРАВЯДЗЕ ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЮ ДЛЯ БЕЛАРУСКІХ І ЗАМЕЖНЫХ СМІ

Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы. Як чакаецца, у мерапрыемстве возьме ўдзел каля 350 журналістаў з розных СМІ.

## БУДЗІШЧАНСКАЯ ВАДЗІЦА



**Прырода шчодра ўзнагародзіла вёску Будзішча крыніцамі, і жыхары гэтага населенага пункта на памежжы Беларусі і Расіі яшчэ з даўніх часоў сталі лічыць ваду праявай Божай ласкі. Таму спрадвеку, як сімвал веры, тут стаяць крыжы з абразамі і аброчнымі ручнікамі.**

Пяць крыніц, якія літаральна «кіпяць» адна каля адной, абгароджаны вялікім зрубам і ўяўляюць незвычайную па плошчы студню, да якой вяскоўцы прыходзяць штодня (і ўзімку таксама), каб зачарпнуць вядзерца-другое гэтага Боскага дару для ўжытку ў ежу, на выкарыстанне ў гаспадарцы. Цяпер рэдка дзе сустрэнеш, каб ваду насілі на каромыслах, а ў Будзішчы гэты спосаб жывы. Бо каромысел служыць таксама і для зачэрпвання. Вось дзе жывая народная традыцыя.

Жыхароў у Будзішчы засталося не шмат. З-за сваёй аддаленасці і пасля чарнобыльскай катастрофы вёска моцна асірацела. Адзін з адданых сваёй малой радзіме Аляксей Максіменка *(на фотаздымку)* прыгадаў, што апошняе абнаўленне крынічнага комплексу дапамагалі рабіць жыхары Японіі — прадстаўнікі адной з дабрачынных арганізацый. Крыніца іх моцна ўразіла. Таму гэты помнік прыроды служыць вяскоўцам яшчэ і добрым напамінам пра самаадданых людзей з далёкай краіны.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

*Чачэрскі раён.*

### *ЦЫТАТА ДНЯ*



**Аляксандр ТУРЧЫН, намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама:**

***Абнаўленне вытворчасцяў у 2013 годзе стане вырашальным фактарам павышэння ў вобласці прадукцыйнасці працы і зніжэння выдаткаў для выпуску канкурэнтаздольнай прадукцыі. Фарміраванне высокаэфектыўных вытворчасцяў будзе праводзіцца адначасова з мадэрнізацыяй традыцыйных сектараў эканомікі. Усяго ў вобласці падлягаюць мадэрнізацыі 93 арганізацыі, якія адносяцца да апрацоўчай прамысловасці, будаўніцтва і сувязі, у тым ліку 39 камунальных арганізацый і 54 арганізацыі ў рэспубліканскай уласнасці. Перад усімі вышэйзгаданымі арганізацыямі стаіць задача дасягнення ў 2015 годзе сярэднямесячнай заработнай платы, эквівалентнай $1 тыс.***

### НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | – 1° |
| Віцебск | – 6° |
| Гомель | – 2° |
| Гродна | – 1° |
| Магілёў | – 1° |
| Мінск | – 1° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.01.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8660,00 | ▲ |
| Еўра | 11310,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 285,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1069,17 | ▼ |

## ДЭФІЦЫТ АРЭНДНАГА ЖЫЛЛЯ Ў МІНСКУ ЎЗМАЦНЯЕЦЦА

**ПРА гэта карэспандэнту «Звязды» паведаміла намеснік генеральнага дырэктара Цэнтра гандлю нерухомасці «ПАКАДАН» Аксана ЛУКАШЭВІЧ.**

### МІНІМАЛЬНЫ ЦЭННІК АДНАПАКАЁВАК — 300 USD

На рынку арэнднага жылля сталіцы застаецца вельмі складаная сітуацыя. Як у лістападзе і снежні зараз у гэтым сегменце нерухомасці катастрафічна не хапае бюджэтных кватэр з адносна невялікімі цэннікамі арэнды. Напрыклад, звычайна за дзень служба агенцтва «ПАКАДАН» прымае каля 55 заявак ад патэнцыяльных кватарантаў, а база прапановы павялічваецца толькі на 20 кватэр, сярод якіх увогуле не існуе жылля ў цэнавым дыяпазоне ніжэй за 300 долараў. Недзе каля 10 кватэр з новай прапановы маюць цэннік ад 500 да 1,5 тысячы долараў.

Так адбылося, што сёння мінімальны кошт арэнды аднапакаёвай кватэры ў любым раёне сталіцы складае 300 долараў. Разам з камунальнымі плацяжамі такое жыллё будзе каштаваць кліенту не менш за 350 долараў.

Аднапакаёвыя кватэры пасля рамонту, з больш сучаснай мэбляй і недалёка ад лініі метро прапануюцца ўжо за 370—420 долараў. Сапраўды прывабныя невялікія аднапакаёўкі ў цэнтры Мінска без праблем здаюцца за 500 долараў.

### ДВУХПАКАЁЎКІ СТАВЯЦЬ НОВЫЯ РЭКОРДЫ

Мацней за ўсё за апошнія два месяцы падаражэлі стандартныя двухпакаёвыя кватэры. Зараз мінімальны кошт такіх кватэр складае 380—400 долараў. Сярэдні кошт двухпакаёвак павялічыўся за гэты час да 400—430 долараў. Непасрэдна побач з лініяй метро якасныя двухпакаёвыя кватэры маюць цэннік ад 450 да 500 долараў.

Разам з тым, спадарыня Лукашэвіч адзначае працэс ускладнення адносін паміж будучымі кватарантамі і гаспадарамі жылля. Зараз па такім вялікім цэнніку спажыўцы патрабуюць і адпаведныя ўмовы камфорту. Такія кватэры павінны быць пасля рамонту, з мэбляй і бытавой тэхнікай, калі абавязковай з'яўляецца прысутнасць пральнай машыны і вялікага халадзільніка.

Менш за астатніх за апошні месяц падаражэлі трохпакаёвыя кватэры. Яшчэ зараз магчыма адшукаць цалкам пустыя трохпакаёўкі ў непрэстыжных раёнах сталіцы за 350—380 долараў плюс аплата камунальных паслуг. Сярэдні кошт шматпакаёвых кватэр застаецца на ўзроўні двухпакаёвак — прыкладна 420—430 долараў. Якасныя трохпакаёвыя кватэры побач з лініяй метро прапануюцца ўжо за 500—600 долараў.

Сапраўды элітнае жыллё вялікіх плошчаў (200—300 кв. метраў) стабільнага попыту цяпер не мае, бо каштуе яно ад 2 да 5—6 тысяч долараў за месяц.

### УЗНІКАЕ АРЭНДНАЕ КАМПАНЬЁНСТВА

Апошнім часам у галоўным мегаполісе краіны адбываецца актыўнае будаўніцтва і развіццё сетак гіпермаркетаў. Гэтыя гандлёвыя структуры прапануюць маладым работнікам добрыя заробкі. На працу ў Мінск пацягнулася вялікая колькасць іншагародніх маладых работнікаў.

Таму зараз у сталіцы назіраецца тэндэнцыя па ўшчыльненні арэнды. Цяпер у сферы жыллёвай нерухомасці нават з'явіўся такі тэрмін, як «кампаньёнства», або хаўрусніцтва, у арэндзе. Сёння самастойна здымаць дарагое жыллё ў Мінску праблематычна. Усё часцей аднапакаёвую кватэру здымаюць некалькі амаль незнаёмых чалавек, а ў двухпакаёўцы жывуць ужо 3—4 кватаранты.

Зараз у агенцтвах нерухомасці кожная чацвёртая заяўка прыпадае на трохпакаёвую кватэру, якую збіраюцца здымаць 4—6 чалавек. Гэта або работнікі гандлёвых кампаній, або студэнты вышэйшых навучальных устаноў.

СТАР. 2

### ІНДЭКСУЕЦЦА МІНІМАЛЬНАЯ ЗАРАБОТНАЯ ПЛАТА ЗА СНЕЖАНЬ 2012 ГОДА

У Беларусі мінімальная заработная плата за снежань 2012 года індэксуецца на 19,5 працэнта, разлічанага нарастаючым падрахункам да студзеня 2012 года (месяца яе ўстанаўлення). Гэта абумоўлена тым, што індэкс спажывецкіх цэн за снежань перавысіў пяціпрацэнтны парог да месяца яе папярэдняй індэксацыі (жнівень 2012 года), паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.

Такім чынам, месячная мінімальная заработная плата за снежань 2012 года складае Br1 млн 171 тыс. 610, пагадзінная мінімальная заработная плата — Br6 тыс. 950. Згодна з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб устанаўленні і парадку павышэння памеру мінімальнай заработнай платы», памер МЗП, устаноўлены заканадаўствам і праіндэксаваны, з'яўляецца абавязковым для наймальніка ў якасці ніжэйшай мяжы аплаты працы работнікаў.

З 1 студзеня 2013 года месячная мінімальная заработная плата ўстаноўлена ўрадам у памеры Br1 млн 395 тыс., пагадзінная — Br8 тыс. 340.

### КАНФІСКАЦЫЯ АЎТАМАБІЛЯЎ У НЕЦВЯРОЗЫХ ВАДЗІЦЕЛЯЎ, ПАЧНЕЦЦА Ў 2013 ГОДЗЕ

**Аб гэтым паведаміў генеральны пракурор Беларусі Аляксандр Канюк.**

Складаная працэдура падрыхтоўкі законапраекта завершана, праект прадстаўлены на разгляд кіраўніка дзяржавы. Пасля гэтага ён будзе ўнесены на разгляд дэпутатаў Нацыянальнага сходу, растлумачыў генпракурор. «Пракуратура настойвае на тым, каб, як толькі ў чалавека за рулём пацвярджаецца факт алкагольнага ап'янення, транспартны сродак канфіскоўваць, а таксама выступае за ўзмацненне адказнасці за гібель людзей. Аднак увядзенне ў практыку гэтых прапаноў будзе залежаць ад заканадаўца», — падкрэсліў генпракурор.

**БЕЛТА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ДОЛЯ УКРАІНЫ Ў ТРАНЗІЦЕ РАСІЙСКАГА ГАЗУ ЎПАЛА НІЖЭЙ ЗА 50%

Доля Украіны ў транзіце расійскага газу ў Еўропу склала ў першай дэкадзе студзеня 42%. Для параўнання, у першым квартале 2011 года доля Украіны была на ўзроўні 63%, а ў першым квартале 2012-га — 56%. Скарачэнне выкарыстання «Газпрамам» газатранспартнай сістэмы Украіны адбываецца на фоне павелічэння загрузкі «Паўночнага патоку» — газаправода, які звязаў Расію і Германію па дне Балтыйскага мора. Чакаецца, што праз некалькі гадоў Расія поўнасцю зможа абыходзіцца без газатранспартнай сістэмы Украіны. Гэта адбудзецца, калі ўступіць у строй «Паўднёвы паток», газаправод па дне Чорнага мора. Яго будаўніцтва пачалося ў канцы 2012 года.

### ХВОРАГА ЧАВЕСА ПАДТРЫМАЛІ МІТЫНГАМ

У сталіцы Венесуэлы ўчора прайшла масавая маніфестацыя ў падтрымку прэзідэнта краіны Уга Чавеса. 10 студзеня павінна была адбыцца яго інаўгурацыя, але з-за стану здароўя кіраўніка краіны яна была адкладзеная Вярхоўным судом на нявызначаны тэрмін. Раней прадстаўнікі апазіцыі заяўлялі, што краіне патрэбны новыя выбары. Але генеральны пракурор Венесуэлы Сілія Флорэс заявіла, што перанос інаўгурацыі не перашкодзіць Чавесу лічыцца абраным прэзідэнтам краіны.

### БРЫТАНСКАЯ КАРАЛЕВА ДАЗВОЛІЛА ДАЧЦЭ ПРЫНЦА УІЛЬЯМА АТРЫМАЦЬ У СПАДЧЫНУ ПРАСТОЛ



У выпадку калі ў прынца Уільяма і Кейт Мідлтан народзіцца дачка, яна будзе насіць тытул прынцэсы, пра гэта заявіла каралева Вялікабрытаніі Лізавета II. Тым самым яна адкарэктавала закон аб атрыманні ў спадчыну прастола, прыняты амаль сто гадоў таму.

Згодна з пастановай караля Георга V, выпушчанай у 1917 годзе, толькі старэйшы сын Уільяма і Кейт, з'яўленне на свет якога можа адбыцца ўжо ў сярэдзіне бягучага года, мог бы называцца прынцам і прэтэндаваць на трон. У выпадку нараджэння дзяўчынкі яна атрымала б толькі тытул лэдзі і не магла б называцца Яе Каралеўскай Вялікасцю. Аднак Лізавета II выпусціла патэнтавую грамату — адмысловага роду каралеўскую аб'яву — закліканую змяніць прыняты парадак для дзяцей Уільяма. Яна апублікавана ў афіцыйнай газеце брытанскага ўрада ў Англіі і Уэльсе The London Gazette і абвяшчае, што ўсе дзеці старэйшага сына Прынца Валійскага (Чарльза) будуць надзелены тытулам і атрыбутамі Каралеўскай Вялікасцю і называцца прынцамі або прынцэсамі. У пачатку снежня мінулага года стала афіцыйна вядома аб тым, што Кейт Мідлтан чакае дзіця.

ISSN 1990 - 763X

### ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ЗША ПРАЙГРАЮЦЬ ВАЙНУ З ГРЫПАМ

Штаты заяўляюць, што сутыкнуліся з адной з самых страшных успышак грыпу. Так, у пачатку эпідэмсезона ў Бостане ўжо адзначаецца дзесяціразовае перавышэнне колькасці хворых у параўнанні з паказчыкамі 2011-2012 гадоў. Медыкі чакаюць рэзкага росту захворвання на тэрыторыі ад Мэна і да Паўночнай Караліны. Бальніцы зрабілі больш жорсткімі правілы наведвання хворых і падрыхтавалі новыя палаты для пацыентаў. У Масачусецы ў гэтым сезоне ад грыпу сканалі 18 чалавек. А ў Паўночнай Караліне фіксуецца самая высокая актыўнасць грыпу за апошнія 10 гадоў. Тут ужо загінулі 14 чалавек. У сваю чаргу, кампанія Challenger, Gray & Christmas папярэджвае: у сувязі з эканамічнымі цяжкасцямі грып можа хутка распаўсюдзіцца па краіне, бо мала хто цяпер дазваляе сабе адлежацца дома і не пайсці на працу.

### КОРАТКА

Служба занятасці Беларусі ў 2012 годзе накіравала на прафесійнае навучанне, перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі звыш 15,4 тыс. чалавек — 7,4 працэнта маючых патрэбу ў працаўладкаванні беспрацоўных.

У 2012 годзе на дарогах Беларусі адбыліся 5146 уліковых ДТЗ, у якіх 1032 чалавекі загінулі, 5527 атрымалі траўмы, паведамілі ва УДАІ МУС Беларусі. У параўнанні з 2011 годам адзначаецца зніжэнне агульнай колькасці ДТЗ на 12,7 працэнта, а колькасці загінуўшых — на 14 працэнтаў, раненых — на 12,7 працэнта. Але лічбы дарожнага траўматызму, за кожнай з якіх рэальныя чалавечыя жыцці і лёсы, усё ж застаюцца высокімі.

Другі міжнародны фестываль кароткаметражных фільмаў Cinema Perpetuum Mobile пройдзе ў Мінску з 12 па 20 студзеня. Праграма кінафоруму вельмі разнастайная — 300 фільмаў з 41 краіны. Яны будуць прадстаўлены ў сямі секцыях: ігравыя і дакументальныя ленты, анімацыя і відэаарт, эксперыментальныя, музычныя фільмы, экалагічныя і дзіцяча-юнацкія карціны.

## ЦІ ЧАСТА ВЫ КАРЫСТАЕЦЕСЯ ПАСЛУГАМІ АБ'ЕКТАЎ ГРАМАДСКАГА ХАРЧАВАННЯ?



**Вераніка ЗЛОБІЧ, вучаніца Ліцэя БДУ, г.Мінск:**

— У кавярні бываю дастаткова часта, пару разоў на тыдзень. Гэта вельмі зручна: і сустрэцца з кімсьці можна, калі на вуліцы доўга не прабудзеш, і пад'есці, паколькі дома будзеш толькі ўвечары. Мінскія аб'екты грамадскага харчавання падабаюцца мне сваім абслугоўваннем, чаго, на жаль, не магу сказаць асабіста пра абласныя.

Вядома, цэны часам падаюцца высокімі, асабліва калі параўноўваць з краінамі-суседкамі. Тую ж каву ў Літве можна набыць за 0,3-0,5 еўра, у нас жа — за 1,5-2,5 еўра.

У кавярнях звычайна заказваю гарбату ці каву. Абедаю ў ліцэйскім блоку харчавання. Там і цэны ніжэйшыя, і, як мне падаецца, ежа больш падобная на хатнюю.



**Віталь ПАЛЯЧКОЎ, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства Запольскай сярэдняй школы Чэрвеньскага раёна:**

— З працай аб'ектаў грамадскага харчавання знаёмы непасрэдна. Справа ў тым, што ў студэнцкія гады падпрацоўваў у адным з рэстаранаў Магілёва. Зараз індустрыя грамадскага харчавання ў Беларусі ўяўляе сабой велізарную колькасць устаноў з самым розным узроўнем абслугоўвання, якасці прадукцыі. На мой асабісты погляд, у гэтай сферы зараз дзве асноўныя праблемы: адсутнасць узаемнай культуры паміж абслуговым персаналам і кліентамі, па-першае. А па-другое, адсутнасць спецыялізаваных дзіцячых кавярняў са сваімі асобнымі меню і забаўляльнай праграмай у невялікіх гарадах.



**Наталля СКРАБЕЦ, старшы інспектар цэнтра прапаганды Міністэрства па надзвычайных сітуацыях:**

— У сталовую я хаджу не часта, таму што часу, каб паабедаць, не так і шмат. Мае калегі таксама харчуюцца на працы і бяруць «ссабойкі». Гэта што тычыцца працоўных дзён. У выхадныя мне, як і большасці моладзі, падабаецца зайсці ў адзін з рэстаранаў хуткага харчавання. У адным з іх усё хутка, якасна і адносна нядорага. У іншым — шмат страў з бульбы, мяса, птушкі. Што датычыцца цэн, там кожны можа выбраць сабе нешта «па кішэні». Прыемна і тое, што ты адразу бачыш страву гатовай.

Што хацелася б пажадаць нашаму грамадскаму харчаванню? У нас, на жаль, няма рэстаранаў беларускай кухні, якія маглі б канкурыраваць з замежнымі рэстаранамі хуткага харчавання. У Мінску, калі захочаш перакусіць, галодным не застанешся. А вось калі выязджаеш са сталіцы ў іншы горад, гэта ўжо робіцца праблемай. Гэта ж датычыцца і нашых дарог, на якіх не хапае ні кавярняў, ні закусачных, і абласных цэнтраў, дзе бульбяную днём з агнём не знойдзеш. Думаю, ёсць над чым падумаць чыноўнікам, якія курыруюць грамадскае харчаванне.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ПЯТНІЦА, 18 СТУДЗЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.15, 8.20** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.55** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 18.25, 0.30** Зона Х.
**9.10** Серыял «Джамайка».
**10.10** Сфера інтарэсаў.
**10.25** Патрабуецца.
**10.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**10.55** Канцэртная праграма.
**12.15** «Зямля беларуская». «Горацкія пацехі».
**12.30** Заўтра — гэта мы!
**13.00** Серыял «Зорныя вароты. Першы атрад».
**14.00** Серыял «Бігль».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Дак. серыял «Магія прыроды».
**16.50** Ток-шоу «Здароўе».
**17.35** Серыял «Маруся. Выпрабаванні».
**19.45** Калыханка.
**19.55** «Зорнае жыццё». «Айчымы зорак».
**21.00** Панарама.
**21.45** Нашы.
**21.55** "Мы — спецназ".
**22.25** Дак. серыял «Містычныя гісторыі».
**23.25** Серыял «Майстры жахаў».
**1.15** Дзень спорту.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.20** «Зразумець. Дараваць».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Танна і добра».
**12.05** Серыял «Няроўны шлюб».
**13.10** «Добрага здаровейка!».
**14.10** «Модны прыгавор».
**15.10** Серыял «Заручальны пярсцёнак».
**16.15** «Ты не адзін».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.05** «Дзве зоркі». Вялікі навагодні канцэрт.
**23.05** Маст. фільм «Пляж».
**1.15** Начныя навіны.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 17.50** Серыял «Следства вядзе Да Вінчы».
**10.10** Кінааповесць «Жыццё і смерць двараніна Чартапханава».
**12.45** Дак. серыял «Мудрагелістыя светы».
**13.40, 21.30** Камедыя «Дэжа вю».
**15.45** Беларуская кухня.
**16.20** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Мужчыны.
**18.55** «Халі-галі». Скетч-шоу.
**19.30** Арэна.
**20.00** Фактар сілы.
**20.30** Рэпарцёр «Беларускай часінкі».
**21.25** КЕНО.
**23.25** Трылер «Двайная ракіроўка-2».

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**9.00** «Каханне 911».
**10.05** «Аўтапанарама».
**10.40** «Пад абаронай».
**11.10, 17.30** «Званая вячэра». Лепшае.
**12.05** «Сямейныя драмы».
**13.00** «Добры дзень, доктар».
**13.50** Маст. фільм «Русалка».
**15.40** «Прыгожа жыць».
**16.50** «Следакі». Серыял.
**18.30** «Такі лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Добры вечар, малы».
**20.30** Камедыя «Толькі пасля вас!».
**23.00** «Спецыяльны праект»: «Гульні розуму».
**0.30** Маст. фільм «Доказ смерці».

### МІР

**5.00** Серыял «Агонь кахання».
**6.40** М/с «Апошні з магікан».
**7.10** «Цік-так».
**7.40** «Джэймі: Абед за 30 хвілін».
**8.10** Серыял «Сэрцу не загадаеш».
**9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 20.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**9.10** Серыял «Гарачы лёд».
**10.45** «На шашлыкі».
**11.15** «Усюды жыццё».
**11.40** «Рэспубліка сёння».
**12.25** Серыял «Трое зверху».
**13.25, 1.25** Маст. фільм «Дзве нядзелі».
**15.25** Серыял «Заручальны пярсцёнак».
**17.00** «Сакрэтныя матэрыялы».
**17.30** «Злачынства і пакаранне».
**18.25** «Акцэнты».
**18.50, 2.55** Маст. фільм «Італьянец».
**21.25** «Любімыя акцёры. А. Панкратаў-Чорны».
**21.55** Маст. фільм «Уваход праз акно».
**23.50** Серыял «Камісар Наваро».

### 8 КАНАЛ

**7.00, 12.15, 18.40, 21.05, 23.45** «Надвор'е».
**7.05, 14.40** Серыял «Клан Сапрана».
**8.20, 14.05** Серыял «Джэйн Эйр».
**8.55, 17.35** Серыял «Мост».
**10.00** «Мой любімы гадаванец».
**10.30, 18.45** Серыял «Цудоўнае стагоддзе».
**12.20** Камедыя «Бедная Саша».
**16.00** «Мультпарад».
**16.15** «Адшукваецца адпачынак».
**16.45** Серыял «Пляткарка».
**20.50** «Вечарніца».
**21.10** Трылер «Вірус».
**23.00** Серыял «Жывая мішэнь».

### ВТБ

**6.00, 0.50** «PLAY».
**8.00, 17.30** «С.У.П.».
**8.30, 14.00, 18.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00** Серыял «Татавы дочкі».
**10.00, 19.00** Серыял «Нанакаханне».
**11.00, 22.20** Серыял «Маргоша».
**12.00** «Прыгажосць патрабуе!».
**13.00, 16.30** Скетч-шоу «Анекдоты».
**13.30, 17.00, 20.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**14.30, 23.30** Серыял «Улётнае відэа».
**15.00** Серыял «Кадэцтва».
**16.00, 18.30, 0.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**21.10** Серыял «Святлафор».
**0.00** «Уральскія пельмені».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Ток-шоу «Справа Х. Следства працягваецца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Мая планета».
**12.00** «Прамы эфір».
**12.50** Серыял «Аб'ект 11».
**13.50, 16.50, 19.50, 0.10** Навіны — Беларусь.
**14.30** Ток-шоу «1000 дробязей».
**15.10** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**15.55** Серыял «Катоўскі».
**17.30** Мясцовы час. Весткі—Масква.
**17.45** Серыял «Інстытут высакародных дзяўчат».
**18.45** Серыял «Ефрасіння. Таежнае каханне».
**20.30** Серыял «Заўсёды кажы «заўсёды»-7».
**22.15** Серыял «Вераніка. Страчанае шчасце».
**0.20** «Гістарычныя хронікі». «1990. Распад».
**1.05** Меладрама «Неідэальная жанчына».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.10** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «І зноў прывітанне!».
**11.10** «Да суда».
**12.05, 13.30** «Суд прысяжных».
**14.35** Серыял «Сужэнцы».
**15.35, 18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**19.25** Серыял «Павуцінне».
**23.00** Маст. фільм «Шпількі-3».
**0.40** Серыял «Рускі дубль».

### ІНТЭР+

**8.00, 9.00, 9.30, 10.00, 13.00** Навіны.
**8.10, 8.35, 9.10, 9.35** Раніца з ІНТЭРам.
**8.30, 21.30, 4.30** Спорт у Падрабязнасцях.
**10.10, 15.55, 1.05** Дак. серыял «Суперзоркі».
**10.35** Серыял «Дзявочае паляванне».
**11.25, 18.40, 6.55** Дак. серыял «Галівудскія сапернікі».
**12.15** Серыял «Заручальны пярсцёнак».
**13.15, 16.45, 0.35** Дак. серыял «Жыццё сярод жыцця».
**13.45, 19.30, 6.10** Серыял «Анёл-ахоўнік».
**14.25, 1.45** Серыял «Сэрцу не загадаеш».
**16.20** Феерыя падарожжаў.
**17.10** Серыял «Выклік».
**17.55, 5.25** Сямейны суд.
**20.15, 3.15** Дак. серыял «Утоеная рэальнасць». 1-я серыя.
**21.00, 4.00** Падрабязнасці.
**21.35** Маст. фільм «Свае дзеці».
**23.05** Маст. фільм «Некалькі інтэрв'ю па асабістых пытаннях».
**1.30** Краіна смяецца.
**4.35** Нобелеўскі канцэрт 2012.

### КУЛЬТУРА

**5.30** «Еўраньюс».
**9.00, 14.40, 18.30, 22.30** Навіны культуры.
**9.20** «Я кахаю». Маст. фільм.
**10.50** «Правінцыйныя музеі». «Рускі Манчэстэр, або Горад нявест».
**11.20** «Сакрэтныя праекты». «Бомба-невідзімка».
**11.45** Да 110-годдзя з дня нараджэння Наталлі Канчалоўскай. «Партрэт у ружовай сукенцы».
**12.30** «Залатая спіраль». Дак. фільм.
**13.25** «Паліглот».
**14.10** «Асабісты час».
**14.50** Яўгенія Сіманава на тэлебачанні. «Ліка». Тэлеспектакль.
**16.20** «Царская ложа». Марыінскі тэатр.
**17.00** Гульні класікаў.
**18.00** «Блакада. Пятая спроба». Дак. фільм.
**18.45** «Ленінградская сімфонія». Маст. фільм.
**20.20, 0.55** «Шукальнікі». «Закінуты горад шаўковага шляху».
**21.05** «Лінія жыцця». Уладзімір Коранеў.
**22.00** Да 150-годдзя з дня нараджэння Канстанціна Станіслаўскага. «Пасля «Майго жыцця ў мастацтве».
**22.50** «Дзіўная драма». Маст. фільм.
**0.40** «Гісторыя аднаго горада». М/ф для дарослых.
**1.40** «Сусветныя скарбы культуры».

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Апошні сезон». Дак. фільм.
**5.30** «Спявае Дзін Рыд». Фільм-канцэрт.
**6.00** «Акцёры і лёсы». В. Талызіна. 1994 год.
**6.40, 0.40** «Мой лёс». Маст. фільм.
**8.00, 14.00, 20.00** «Час».
**9.00, 15.00, 3.00** «Народжаныя ў СССР».
**10.00, 16.00** «Праграма А». 1990 год.
**11.00** «І жартам, і ўсур'ёз». 1987 год.
**11.35** ВІА «Самацветы». Фільм-канцэрт.
**12.05** «Гандлёвы рад». 1991 год.
**12.30, 18.30** «Мегрэ і чалавек на лаўцы». Тэлеспектакль.
**17.00** «Камера глядзіць у свет». 1987 год.
**17.50** «Музыка дажджу». Фільм-канцэрт.
**21.00** «Колба часу».
**22.00** «Кругом ды навокал». Дак. фільм.
**23.05** «Бітламанія».
**0.00** «Прызнанне ў каханні». Дак. фільм.
**4.00** «Свет танца». Дак. фільм.

### MTV

**5.00, 3.50** Music.
**6.00** Ранішні Фрэш.
**8.00, 11.00** Арол і рэшка.
**9.00** Дамашняе відэа зорак.
**9.30, 23.30** News блок.
**10.00** Джэймі: абед за 30 хвілін.
**10.30** Джэймі: у пошуках смаку.
**12.00, 21.30** «Закрытая школа». Серыял.
**14.00** «Вольны».
**14.30** Тваю маму.
**15.00** Дыскатэка 80-х. Канцэрт.
**19.10, 0.00** «Сэкс у вялікім горадзе». Серыял.
**20.30, 0.50** «Канікулы ў Мексіцы-2».
**1.20** «Як я сустрэў вашу маму». Серыял.
**2.20** Славутыя ахвяры пластычнай хірургіі: прыгажуні і пачвары.

### EUROSPORT

**5.00, 18.45, 1.45, 3.00** Тэніс. Australian Open.
**16.30** Біятлон. Кубак свету.
**17.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**20.15, 2.30** Тэніс. Гейм, Сэт, Матс.
**20.45, 1.00** Ралі-рэйд Дакар.
**21.15** Снукер. Мастэрс.
**1.30** Аўтаспорт. Акадэмія GT.

### НАША КІНО

**6.30, 12.30** Драма «Дваццаць дзён без вайны».
**8.30, 14.30** Дэтэктыў «Аніскін і Фантамас».
**10.45, 16.45** Кінааповесць «Ваш сын і брат».
**18.30, 0.30** Прыгоды «Без права на правал».
**20.30, 2.30** Драма «Прызнанне ў каханні».
**22.45, 4.45** Меладрама «Містар Ікс».

### ДОМ КІНО

**3.00** Меладрама «Знайдыш-3».
**6.05** Кароткаметражны фільм «Мае канікулы».
**6.30, 8.20, 17.00, 18.50, 2.00** «Акно ў кіно».
**6.35, 17.05** Серыял «Кавалеры марской зоркі».
**7.30, 18.00, 2.05** Серыял «Фурцава».
**8.25** Камедыя «Вяселле па абмене».
**10.00** Камедыя «13 даручэнняў».
**11.05** Меладрама «Сатысфакцыя».
**12.45** Кінарост. Алена Якаўлева ў драме «Інтэрдзяўчынка» і трагікамедыі «Карасі».
**19.00** Драма «Далёка ад вайны». Заключныя серыі.
**20.50** Драма «Дзённік яго жонкі».
**22.40** Камедыя «Рускі сувенір».
**0.30** Меладрама «Уварванне».

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05** «Паміж намі».
**5.20, 7.40, 2.20** Серыял «Навінавае радыё».
**6.15** Маст. фільм «Зануда».
**8.00, 12.55, 16.00, 21.00** Серыял «Нед і Стэйсі».
**8.30** Маст. фільм «Карнавал».
**11.15** Маст. фільм «Хлапечнік у Лас-Вегасе».
**13.45, 20.40, 21.50, 23.50, 1.45** «Камедыянты».
**14.10** Маст. фільм «Вясельная вечарынка».
**17.20** Маст. фільм «Мая каханая брунетка».
**19.20** Маст. фільм «Інспектар Гаджэт».
**22.10** Маст. фільм «Няма чаго страчваць».
**0.10** Маст. фільм «Закахацца ў нявесту брата».
**3.25** Маст. фільм «Законы прывабнасці».

### ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**2.00, 8.00, 14.00** Прыгоды «Цімур і яго каманда», 2-я серыя.
**3.05, 9.05, 15.05** М/с «Доктар Айбаліт». М/ф: «Закон племені», «Мараплаванне Солнышкіна», «Ветрык».
**4.00, 10.00, 16.00** М/с «Сандакан. Два тыгры». Казкі народаў свету. «Дзень нараджэння». М/ф «Пра дудачку і птушку».
**5.00, 11.00, 17.00** Маст. фільм «Мой добры тата». М/ф «Чароўная палачка».
**6.30, 12.30, 18.30** М/с «Супергероі».
**7.00, 13.00, 19.00** «Урокі цётачкі Савы». Казкі народаў свету. «Верлівока».

### ТЭЛЕКЛУБ

**20.00** Серыял «Масква. Тры вакзалы-5».
**21.00** Серыял «Агент асобага назначэння-2».
**22.00** Серыял «Мент у законе-4».
**23.00** Серыял «Эра Стральца-2».
**0.00** Серыял «Крот-2».
**1.00** Серыял «Рускі шакалад».

### ТБ3

**5.00** М/ф.
**6.15, 7.10, 8.05** Серыял «Падмані мяне».
**9.00, 16.00** «Паралельны свет».
**10.00, 17.00** Х-Версіі.
**10.30, 11.00** Дак. фільм «Паляўнічыя на прывідаў».
**11.30** Дак. фільм «Гарадскія легенды».
**12.00** Серыял «Малады ваўкадаў».
**13.00, 14.00** Дак. фільм «Загадкі гісторыі».
**15.00, 15.30** Дак. фільм «Варажбітка».
**18.00, 19.00** Серыял «Мерлін».
**20.00** Маст. фільм «Экстрасэнс».
**22.15** Маст. фільм «Пярэваратні».
**0.00** Еўрапейскі покерны тур.
**1.00** Маст. фільм «Акулы-3».
**3.00** Дак. фільм «Грандыёзныя праекты».
**4.00** Серыял «Партал юрскага перыяду».

### ТБ1000

**3.00, 1.20** Камедыя «Уваход выхад».
**4.45** Драма «Апошняя справа Ламаркі».
**6.45** Камедыя «Бугі-вугі».
**8.30** Трагікамедыя «Мачаха».
**10.45** Баявік «Шафт».
**12.30** Драма «Мядзведнік».
**14.45** Камедыя «Школа рока».
**16.45** Камедыя «Кошкі-мышкі».
**19.00** Прыгоды «Ізгой».
**21.30** Трылер «Запаведная дарога».
**23.20** Жахі «Званок».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Камедыя «Тры дні з прыдуркам».
**8.00** Меладрама «Дзісай».
**10.00** Драма «Мінесота».
**12.00** Камедыя «Дзед Мароз заўсёды звоніць... тройчы!».
**14.00** Драма «Абвінавачваюцца ў забойстве».
**16.00** Камедыя «Клуб шчасця».
**17.50** Драма «Матч».
**20.00** Меладрама «Хутка вясна».
**22.00** Камедыя «Асаблівасці нацыянальнай падлёднай лоўлі, або Адрыў па поўнай».
**23.40** Меладрама «Толькі не сыходзь...».
**1.40** Драма «Дом на Англійскай набярэжнай».
**4.00** Драма «Каралі для маёй каханай».

### ІЛЮЗІЁН

**0.40** Эпоха герояў.
**2.15, 23.05** Трусіная нара.
**3.45** Асноўны інстынкт 2.
**5.35** Ідэальныя ўцёкі.
**7.10** Сны пра рыбу.
**9.00** Блізняты.
**10.40** Каханне здараецца.
**12.25** ЗащитнеГ.
**14.05** Амерыканскае злачынства.
**15.35** Місіс Хендэрсан прадстаўляе.
**17.15** Забіць Біла 2.
**19.30** Маналетэ.
**21.00** Дэтэктыў «Дзі».

### «CBS DRAMA»

**8.00** Плата не па заслугах.
**8.50** Парадоксы кахання.
**9.40, 13.50, 18.50** Дымок са ствала.
**10.30, 15.30, 22.10** Дынастыя.
**11.20, 17.10, 2.30** Мэтлак.
**12.10, 16.20, 21.20** Тайны айца Даўлінга.
**13.00, 18.00, 23.50** Гаваі 5-0.
**14.40, 15.05, 20.30, 20.55, 0.40, 1.10** Новая Змрочная Зона.
**19.40, 23.00, 1.35** 4400.
**3.25** Неўтаймоўная Хільда.
**4.20** Жанчыны.
**5.15** Пражыць жыццё.
**6.10** Мая Папялушка.
**7.05** Ніколі не позна?

### AXN-SciFi

**0.10, 5.00, 11.20** Серыял «Лекс».
**1.00, 3.20, 5.50, 12.10** Серыял «Зорны шлях».
**1.45, 4.10, 13.00, 23.30** Серыял «Фактар страху».
**2.30, 21.25** Серыял «Звышнатуральнае».
**6.30, 7.00, 10.25, 10.50** Серыял «Fullmetal Alchemist».
**7.30, 13.50, 18.15, 22.45** Серыял «Паляўнічыя на прывіды».
**8.15, 16.00** Серыял «Якая размаўляе з прывідамі».
**9.00, 16.45, 20.40** Серыял «Тайны Смалвіля».
**9.40, 17.30, 22.10** Серыял «Застаца ў жывых».
**14.35** Серыял «Поўня».
**19.00, 19.55** Серыял «Торчвуд — Дзень Цуду».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 10.00** Самы цяжкі ў свеце рамонт.
**6.00** Самыя небяспечныя сустрэчы.
**7.00** Злачынствы супраць прыроды.
**8.00, 12.00, 16.00** НЛА над Еўропай.
**9.00, 13.00** У пагоні за НЛА.
**11.00, 19.00** Мегазаводы.
**14.00** Горад мурашак.
**15.00** Востраў.
**17.00** Правер свой мозг.
**18.00, 2.00** У чаканні канца свету.
**20.00, 23.00, 4.00** Апакаліпсіс.
**21.00, 0.00** Сямейная зброя.
**22.00, 1.00** Дзікі тунец.
**3.00** Ліхтугі за мяжой.

### DISCOVERY

**7.00, 12.20, 18.15, 3.55** Разбуральнікі легендаў.
**7.50, 11.25, 3.05** Гіганцкія будоўлі.
**8.40, 19.10** Як гэта ўстроена?
**9.10, 19.40, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35, 17.20, 5.10** Выжыць любой цаной.
**10.30** Лабараторыя для мужчын.
**13.15** Хлопцы з гарматамі.
**14.10, 21.00** 80 спосабаў абагнуць зямны шар.
**15.05, 20.05, 0.55** Top Gear.
**16.00, 6.05** Шэдэўры на колах.
**16.55** Пятая перадача.
**22.00** Ланцуговая рэакцыя.
**23.00** У пошуках еці.
**0.00, 0.30** Сапраўдныя аферысты.
**1.50** Маланкавыя катастрофы.
**2.15** Расшыфроўка катастрофы.

### ANIMAL PLANET

**7.00, 16.00** Самае дзікае шоу.
**7.25, 7.50** Усё пра сабак.
**8.15, 16.30** Сабакі, коткі і іншыя любімцы.
**9.10, 9.35, 19.40** Ветэрынар Бандай Біч.
**10.05** У нетрах Афрыкі.
**11.00** Паліцыя Філадэльфіі — аддзел па абароне жывёл.
**11.55, 4.55** Дрэсіроўшчык па выкліку.
**12.20, 6.35** SOS дзікай прыроды.
**12.50, 5.45** Заатур Мікаэлы.
**13.45** Тэрыторыя жывёл.
**14.40, 20.10** Перакладчык з сабачай.
**15.35, 5.20** Царства гепардаў.
**17.25** Планета малых.
**18.20** Дрэнны сабака.
**19.15** Малпіна жыццё.
**21.05, 2.25** У нетрах Лацінскай Амерыкі.
**22.00, 3.15** Напад акул.
**22.55, 4.05** Войны жукоў-гігантаў.
**23.50** Паліцыя Фенікса — аддзел па абароне жывёл.
**0.45** Прыгажосць змей.
**1.35** Дзікія і небяспечныя.

### ЗДАРОЎЕ

**5.00, 20.00** Панацэя.
**5.30, 20.30** Генезіс здароўя.
**6.15, 21.15** Дзіцячы ўрач.
**6.45, 21.45** Элемент здароўя.
**7.15, 22.15** Сімптомы і ілюзіі.
**7.45, 22.45** Дыхайце правільна.
**8.00, 23.00** Спартыўныя траўмы.
**8.30** Гісторыя лекаў.
**9.00, 0.00** Будзь у тонусе!
**9.30** Масажы.
**10.00** Жаночае здароўе.
**10.30, 1.30** Колькі вам гадоў?
**11.00, 2.00** Першая дапамога.
**11.15, 2.15** Педыятрыя.
**11.45, 2.45** Гісторыя хвароб.
**12.15, 3.15** Шлях да здароўя.
**12.40, 3.40** Дыялогі пра харчаванне.
**13.30, 4.30** Кабінет прыгажосці.
**14.00** Выдаткі вытворчасці.
**14.30** Як Вы сябе адчуваеце?
**15.00, 0.45** Гэта карысна ведаць!
**15.45** Энцыклапедыя памылак.
**16.00** Памылкі здароўя.
**16.30** Алкаголь, тытунь, наркотыкі.
**17.00** Не выходзячы з дому.
**17.30** Гімнастыка.
**18.00** Доктар клоўн.
**18.35** Клетка.
**19.30** Я чакаю дзіця.
**23.30** Старажытны шлях да здароўя.
**0.30** Дыета.

### ТДК

**6.00, 7.50, 13.50, 16.55, 17.50, 18.50, 21.50** Парады ТДК.
**6.25, 9.00, 15.00, 21.20** Усё лепшае для вас.
**7.25, 12.00, 18.00, 21.00, 5.00** Ваш доктар.
**8.00** Добрай раніцы, каханая!
**10.00, 17.00** Красуня.
**11.00, 16.00, 20.00, 0.30** Ваш асабісты псіхолаг.
**13.00, 2.10** Нашы дзеці.
**14.00, 1.20** Твой дом.
**19.00, 22.50, 4.00** Люстэрка жыцця.
**22.00, 23.40** Сэксуальная рэвалюцыя.
**3.00** Гісторыя поспеху.

## СУБОТА, 19 СТУДЗЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**7.15** Існасць.
**7.40** Слова Мітрапаліта Філарэта на Хрышчэнне Гасподняе (Вадохрышча).
**7.50** Добрай раніцы, Беларусь!
**9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**9.10** Здароўе.
**10.00, 23.45** Серыял «Мужчына ўва мне».
**11.05** «Усё як трэба!».
**11.35** Зямельнае пытанне.
**12.10** «Мы — спецназ».
**12.40** Трагікамедыя «Радня».
**14.15** Вакол планеты.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Дак. серыял «Магія прыроды».
**16.05** Меладрама «Інсайт».
**17.50** Дак. серыял «Неверагодныя гісторыі кахання».
**18.35** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**19.10** Дэтэктыў «Кідалы».
**21.00** Панарама.
**21.40** Драма «Арол дзявятага легіёна».
**23.35** Дзень спорту.
**0.35** Перазагрузка.

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** «Смяшарыкі».
**9.25** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** «Разумніцы і разумнікі».
**11.55** Камедыя «Мітусня».
**13.35** «Яўген Веснік. Жывіце наросхрыст».
**14.35, 16.20** «Абракадабра».
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**17.00** Маст. фільм «...У стылі Jazz».
**18.45** «Хвіліна славы». Залатыя старонкі.
**21.05** Канцэрт удзельнікаў праекта «Я спяваю».
**23.25** Маст. фільм «Апошні кароль Шатландыі».
**1.25** Дэтэктыў «Ніягара».

### БЕЛАРУСЬ 2

**8.00** Звон.
**8.30** Фільм-казка «Рыжы, сумленны, закаханы». 1-я серыя.
**9.45** Серыял «Святлафор».
**10.50, 21.05** Тэлебарометр.
**10.55** Пазакласная гадзіна.
**11.15** Альбарутэнія.
**11.50** Наперад у мінулае.
**12.25** Пад грыфам «Вядомыя».
**13.00** Беларуская кухня.
**13.35** Біятлон. Кубак свету. Гонка праследавання. Жанчыны.
**14.20, 23.45** Маст. фільм «Зімовы вечар у Гаграх».
**16.05** Парушаючы запаведзі...
**16.55** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Амур».
**19.15** Ваша лато.
**20.00** Латарэя «Пяцёрачка».
**20.10** Біятлон. Кубак свету. Гонка праследавання. Мужчыны.
**21.00** КЕНО.
**21.10** «Імперыя песні». Караоке-шоу.
**22.15** Гандбол. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Саудаўская Аравія — Беларусь.

### СТБ

**6.20** «Салдаты. Дэмбель непазбежны». Серыял.
**8.00** Камедыя «Толькі пасля вас!».
**9.55** «Жыць будзеце».
**10.15** «Чыстая праца».
**11.00** «Жанчыны XX стагоддзя». «Клара Лучко. Жанчына з зззяючымі вачыма».
**11.30** «Мінск і мінчане».
**12.05** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**13.05** «Прыгоды дылетанта».
**13.40** Меладрама «Па сямейных абставінах». 1-я серыя.
**15.00** «Ваенная тайна».
**16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.40** Маст. фільм «Бомж».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** Меладрама «P.S. Я кахаю цябе».
**22.25** «Дзіўная справа».
**23.20** Маст. фільм «Наталі».
**1.10** «Глядзець усім!».

### МІР

**5.00** Маст. фільм «Музычная гісторыя».
**6.25** М/ф.
**7.40** «Мільён пытанняў пра прыроду».
**7.55** М/с «Смяшарыкі».
**8.15** «Эксперыментатары».
**8.30** «Мар! Дзейнічай! Будзь!».
**9.00, 15.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**9.10** «Зроблена ў СССР».
**9.40** «На шашлыкі».
**10.10** «Любімыя акцёры».
**10.40, 23.50** Серыял «Чэмпіён».
**15.10** Маст. фільм «Сумленне».
**16.50** Маст. фільм «Скажы, што ты кахаеш».
**19.55** «Навіны Садружнасці (бягучы радок). Культура».
**20.40** «Практычная магія».
**21.30** Маст. фільм «Ганна Карэніна».
**23.25** «Музычны ілюмінатар».

### 8 КАНАЛ

**9.00, 13.20, 18.55, 21.00, 23.50** «Надвор'е».
**9.05** «Мультпарад».
**9.15** «На рыбалку».
**9.30** Серыял «Цудоўнае стагоддзе».
**11.30** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**11.45** Баявік «Перавозчык».
**13.25** Драма «Адвакат д'ябла».
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30** Фільм — дзецям.
**18.00** «Тэлефабрыка».
**18.10** Серыял «Лас Вегас».
**19.00** Меладрама «Ночы ў Раданце».
**20.45** «Вечарніца».
**21.05** Трылер «Падазроныя асобы».

### ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.30** Серыял «Татавы дочкі».
**9.30, 17.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**10.00** «Бітва інтэр'ераў».
**11.00** «Сукенка маёй мары».
**11.30** «З'ешце зараз жа».
**12.00, 20.00, 23.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**12.30, 17.30, 0.00** Скетч-шоу «Анекдоты».
**13.00, 23.30** Серыял «Улётнае відэа».
**13.30, 16.00, 20.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**14.00** Серыял «Фізіка або хімія».
**18.00** «Уральскія пельмені».
**21.00** «Добрыя жарты».
**0.30** Серыял «Галыгін.ru».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** Меладрама «Неідэальная жанчына».
**8.45** Меладрама «Дзевяць прыкмет здрады».
**10.25** «Ранішняя@пошта».
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** М/ф.
**12.15** Драма «Белы Бім Чорнае вуха». 1-я серыя.
**14.15** «Сумленны дэтэктыў».
**14.50** «Лекары. Расплата за недасведчанасць».
**15.45** «Акцёрская рулетка. Юрый Каморны».
**16.40** Серыял «Сваты».
**18.05** «Суботні вечар».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.40** Маст. фільм «Калі б я была Царыца...».
**0.00** Драма «Альпініст».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.30** Серыял «Агент асаблівага прызначэння».
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.20** Агляд.
**8.50** «Гатуем».
**9.25** «Справа густу».
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.20** Серыял «Версія».
**15.10** Камедыя «Масквічы».
**16.20** «Следства вялі...».
**17.10** «Вочная стаўка».
**18.00** Выратавальнікі.
**18.30** Надзвычайнае здарэнне.
**19.30** Серыял «Адысея сышчыка Гурава».
**22.55** Баявік «Антыснайпер».
**0.35** «Бенефіс Ірыны Панароўскай».

### ІНТЭР+

**8.00** Канцэрт Анжалікі Агурбаш.
**10.20** Скетч-шоу «ПанаЕхала».
**10.45** Дак. серыял «Утоеная рэальнасць». 1-я серыя.
**11.30** Дак. серыял «Выдатнае 20 стагоддзе». 1-я серыя.
**12.30** Серыял «Кантор». 1-я серыя.
**13.20** Маст. фільм «Сыходзячы — сыходзь».
**14.45** Маст. фільм «Некалькі інтэрв'ю па асабістых пытаннях».
**16.20, 6.10** Маст. фільм «Свае дзеці».
**17.50, 0.50** Канцэрт «Алег Карамазаў і браты».
**21.00, 4.00** Падрабязнасці.
**21.25, 4.25** Вячэрні квартал.
**23.10** Маст. фільм «Пятроўка, 38».
**0.35** Краіна смяецца.

### КУЛЬТУРА

**5.30** «Еўраньюс».
**9.00** Біблейскі сюжэт.
**9.35** «На падмостках сцэны». Маст. фільм.
**11.00** «Васіль Васільевіч Меркур'еў». Дак. фільм.
**11.40** Пернікавы домік. «Разьбяны абраз».
**12.05** Вялікая сям'я. Міхаіл Багдасараў.
**13.00** «Каралеўства крывых люстэркаў». Маст. фільм.
**14.15** «У краіне нявывучаных урокаў», «Васьміножкі». М/ф.
**14.45** Невядомая Еўропа. «Ам'ен і Генуя, або Мошчы Іаана Хрысціцеля».
**15.10** Успамінаючы вялікую спявачку. Гістарычныя канцэрты. Галіна Вішнеўская і Мсціслаў Растраповіч.
**16.10** «Балапан — крылы Алтая». Дак. фільм.
**17.05** «Паслухайце!». Вечар Яўгена Сцяблова ў Маскоўскім міжнародным Доме музыкі.
**18.00** «Больш, чым каханне». Павел Філонаў і Кацярына Серабракова.
**18.45** «Рамантыка рамансa».
**19.40** «Вялікая тайна вады». Дак. фільм.
**21.10** «Белая студыя».
**21.50** Кіно на ўсе часы. «Апошні кінасеанс». Маст. фільм.
**23.50** «РОКавая ноч».
**0.55** «Легенды сусветнага кіно». Зоя Фёдарава.
**1.25** «Звычайны канцэрт».

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «І жартам, і ўсур'ёз». 1987 год.
**5.35** ВІА «Самацветы». Фільм-канцэрт.
**6.05** «Гандлёвы рад». 1991 год.
**6.30, 12.30** «Мегрэ і чалавек на лаўцы». Тэлеспектакль.
**8.00, 14.00, 2.00** «Час».
**9.00, 3.00** «Народжаныя ў СССР».
**10.00, 4.00** «Праграма А». 1990 год.
**11.00** «Камера глядзіць у свет». 1987 год.
**11.50** «Музыка дажджу». Фільм-канцэрт.
**15.00** «Колба часу».
**16.00** «Кругом ды навокал». Дак. фільм.
**17.05** «Быў час». 2009 год.
**18.10** «Пад знакам задыяка. Казярог». 1994 год.
**19.30** «Лесвіца Якаба». 1987 год.
**21.00** «Пераклад з англійскай». Маст. фільм.
**23.00** «Апошні сезон». Дак. фільм.
**23.30** «Спявае Дзін Рыд». Фільм-канцэрт.
**0.00** «Акцёры і лёсы». В. Талызіна. 1994 год.
**0.40** «Мой лёс». Маст. фільм.

### MTV

**5.00, 3.00** Music.
**6.30** М/ф.
**7.00** «Залатыя рогі». Маст. фільм.
**9.00** «Лэсі». Маст. фільм.
**10.30** Арол і рэшка.
**11.30** «Эльф, які скраў Каляды». М/ф.
**13.30** «Грыфан». Маст. фільм.
**15.30** «Прыгоды караля Артура». Маст. фільм.
**17.30** «Выпадковы муж». Маст. фільм.
**19.30, 21.30, 0.00** «Канікулы ў Мексіцы-2».
**22.00** «Каханне. ru». Маст. фільм.

### EUROSPORT

**5.00, 3.00** Тэніс. Australian Open.
**16.30** Біятлон. Кубак свету.
**18.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**18.45, 21.30** Футбол. Кубак Афрыкі.
**21.00, 2.30** Тэніс. Гейм, Сэт, Матс.
**0.00** Снукер. Мастэрс.
**2.00** Ралі-рэйд Дакар.

### НАША КІНО

**6.30, 12.30** Прыгоды «Без права на правал».
**8.30, 14.30** Драма «Прызнанне ў каханні».
**10.45, 16.45** Меладрама «Містэр Ікс».
**18.30, 0.40** Камедыя «Нябесны ціхаход».
**20.00** Плюс кіно.
**20.30, 2.30** Драма «Гамлет».
**23.00, 5.00** Камедыя «Кар'ера Дзімы Горына».

### ДОМ КІНО

**3.00** Драма «Далёка ад вайны».
**6.30, 8.20, 17.00, 18.50, 2.00** «Акно ў кіно».
**6.35, 17.05** Серыял «Кавалеры марской зоркі».
**7.30, 18.00, 2.05** Серыял «Фурцава».
**8.25** Камедыя «Свята Нептуна».
**9.20** Драма «Чапаеў».
**10.55** Меладрама «Адзінокая жанчына з дзіцем».
**12.50** Камедыя «Паўночны матылёк».
**13.30** Серыял «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку».
**19.00** Камедыя «Ёлкі 2».
**20.40** Дэтэктыў «Спыніўся цягнік».
**22.15** Камедыя «Светлая асоба».
**23.40** Фільм-прыпавесць «Карабель».

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.20** «Паміж намі».
**5.20, 12.50, 20.55** Маст. фільм «Бадзяга».
**5.50, 13.30, 21.30** Маст. фільм «Яго перараджэнне».
**6.15** Маст. фільм «Хлапечнік у Лас-Вегасе».
**7.45, 15.55, 2.40** Маст. фільм «Паліцыя».
**8.15, 16.25, 3.10** Маст. фільм «Паміж двума ліўнямі».
**8.30, 16.35, 3.20** Маст. фільм «Жорсткае, жорсткае каханне».
**8.40, 13.45, 18.35, 21.50** «Камедыянты».
**9.00** Маст. фільм «Вясельная вечарынка».
**11.15** Маст. фільм «Мая каханая брунетка».
**14.10** Маст. фільм «Няма чаго страчваць».
**17.20** Маст. фільм «Інспектар Гаджэт».
**19.20** Маст. фільм «Інспектар Гаджэт 2».
**22.10** Маст. фільм «Мужчыны ў вялікім горадзе».
**23.55** Маст. фільм «Карнавал».
**3.35** Маст. фільм «Зануда».

### ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**2.00, 8.00, 14.00** Фільм-казка «Сіняя птушка».
**3.35, 9.35, 15.35** М/с «Доктар Айбаліт». М/ф «Адзін конік белы».
**4.00, 10.00, 16.00** М/с «Сандакан. Два тыгры». Казкі народаў свету. «Сын каменя», «Сын каменя і велікан».
**5.00, 11.00, 17.00** Прыгоды «Ягорка». М/ф «Казка дзядулі Ай-По».
**6.30, 12.30, 18.30** М/с «Супергероі».
**7.00, 13.00, 19.00** «Урокі цётачкі Савы». М/ф «Вожык у тумане».

### ТЭЛЕКЛУБ

**20.00** Серыял «Масква. Тры вакзалы-5».
**21.00** Серыял «Агент асобага назначэння-2».
**22.00** Серыял «Мент у законе-4».
**23.00** Серыял «Эра Стральца-2».
**0.00** Серыял «Крот-2».
**1.00** Серыял «Рускі шакалад».

### ТБ3

**5.05** М/ф.
**8.45** Маст. фільм «Чарадзейная сіла».
**10.15, 1.45** Маст. фільм «Неверлэнд».
**13.45, 14.45** Серыял «Мерлін».
**15.45** Маст. фільм «Экстрасэнс».
**18.00** Маст. фільм «Упусці мяне».
**20.30** Маст. фільм «Крумкач».
**22.30** Маст. фільм «Джона Хекс».
**0.00** Маст. фільм «Пярэваратні».

### ТБ1000

**3.00** Драма «Мядзведнік».
**5.10** Прыгоды «Ізгой».
**7.45** Камедыя «Кошкі-мышкі».
**10.00** Камедыя «Школа рока».
**12.00** Камедыя «Як адчапіцца ад хлопца за 10 дзён».
**14.30** Драма «Трэнер Картэр».
**17.00** Прыгоды «Лемані Снікет: 33 няшчасці».
**19.00** Трылер «Дзяўчына з вады».
**21.00** Жахі «Званок».
**23.00** Драма «Адступнікі».
**1.25** Прыгоды «Аксана ў краіне цудаў».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Камедыя «Дзед Мароз заўсёды звоніць... тройчы!».
**8.00** Драма «Дом на Англійскай набярэжнай».
**10.00** Драма «Матч».
**12.10** Драма «Старыя».
**14.20** Камедыя «Асаблівасці нацыянальнай падлёднай лоўлі, або Адрыў па поўнай».
**16.00** Меладрама «Хутка вясна».
**17.55** Меладрама «Залаты ключык».
**20.00** Драма «Француз Сярожа».
**22.00** Драма «ПіраМММіда».
**0.00** Камедыя «Нявеста любой цаной».
**2.00** Дэтэктыў «Піражкі з бульбачкай».
**04.00** Камедыя «Адам і ператварэнне Евы».

### ІЛЮЗІЁН

**0.35** Ідэальныя ўцёкі.
**2.40, 22.25** ЗащитнеГ.
**4.40** Місіс Хендэрсан прадстаўляе.
**6.25** Забіць Біла 2.
**8.35** Маналетэ.
**10.10** Дэтэктыў «Дзі».
**12.15** Асноўны інстынкт 2.
**14.05** Сны пра рыбу.
**15.55** Блізняты.
**17.40** Каханне здараецца.
**19.30** Амерыканскія жыгала.
**20.50** Закахацца ў нявесту брата.

### «CBS DRAMA»

**8.00** Плата не па заслугах.
**8.50** Дымок са ствала.
**13.00** Гаваі 5-0.
**17.10** Супраць яе волі: Гісторыя Кэры Бак.
**18.50** 4400.
**23.00, 1.30, 5.50** Сёгун.
**23.50, 4.10** Варожы намер.
**2.25** Ракавое прызнанне: Тайны айца Даўлінга.
**6.35** Гарачае захапленне.
**7.00** Без вестак зніклая.

### AXN-SciFi

**0.25, 5.00, 11.15** Серыял «Лекс».
**1.10, 3.20, 5.45, 12.00** Серыял «Зорны шлях».
**1.45, 4.05** Серыял «Фактар страху».
**2.30, 20.20, 21.10, 22.00** Серыял «Звышнатуральнае».
**6.30, 7.00, 7.25** Серыял «Сшытак смерці».
**7.50** Серыял «Fullmetal Alchemist».
**8.15, 8.40** Серыял «Зорны дэсант».
**9.05, 9.30, 10.00** Серыял «Бліч».
**10.30** Серыял «Паляўнічыя на прывіды».
**12.50, 13.35, 14.20** Серыял «Зорныя вароты».
**15.00, 15.50** Серыял «Якая размаўляе з прывідамі».
**16.35** Серыял «Стаўпы Зямлі».
**17.35, 18.15, 22.45, 23.30** Серыял «Тайны круг».
**19.00** Серыял «Поўня».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 12.00** Мегазаводы.
**6.00** Бітва за буйвалаў.
**7.00** Дзікія жывёлы Поўначы.
**8.00** Амерыканскія цыганы.
**9.00** Зусім сакрэтна.
**10.00** Уцёкі.
**11.00** Машыны.
**13.00** Дзікі тунец.
**14.00** Супердрапежнікі.
**15.00** «Канкордыя»: праз год.
**16.00** «Коста Канкордыя»: трагедыя ў кадры.
**17.00** Радаслоўная чалавецтва.
**19.00** Апошняя львіца.
**20.00, 1.00** Ліхтугі за мяжой.
**21.00, 2.00** Злавіць кантрабандыста.
**22.00** Панарама 360°.
**23.00, 4.00** Мяжа.
**0.00** Расследаванне авіякатастроф.
**3.00** Забароны.

### DISCOVERY

**7.00, 17.20** Як гэта ўстроена?
**7.25, 12.45** Змеяловы.
**8.15, 23.00** Махінатары.
**9.10, 19.10, 20.05** Залатая ліхаманка.
**10.05, 3.30** Экстрэмальныя выхадныя.
**11.00, 11.25** Вытворчасць: гонка з часам.
**11.50** Сістэмы кіравання.
**13.40** Сапраўдныя аферысты.
**14.35** 80 спосабаў абагнуць зямны шар.
**15.30, 21.00, 5.10** Top Gear.
**16.25, 22.00, 6.05** Амерыканскі чопер.
**17.50, 4.45** Як гэта зроблена?
**18.15** Спецназ «Цяжкія машыны».
**20.05** Брудная работка.
**0.00** Вернер Херцаг: шлях смяротніка.
**0.55** Рачныя монстры.
**1.50** Хлопцы з гарматамі.
**2.40** У пошуках еці.
**4.20** Маланкавыя катастрофы.

### ANIMAL PLANET

**7.00** Маёнтак сурыкатаў.
**7.25** Сабакі, коткі і іншыя любімцы.
**8.15** Паляўнічы на кракадзілаў.
**9.10** Незвычайныя жывёлы.
**10.05** Малпіна жыццё.
**10.30** Дзік і Дом спяшаюцца на дапамогу.
**11.00** Прыроджаныя паляўнічыя.
**11.25** Самае дзікае шоу.
**11.55, 21.05, 2.25, 5.45** У нетрах Афрыкі.
**12.50** Суровая Арктыка.
**13.45, 14.40, 15.35, 16.30, 17.25** У нетрах Лацінскай Амерыкі.
**18.20, 19.15** Хуткасць жыцця.
**20.10** Перакладчык з сабачай.
**22.00, 3.15** Дрэнны сабака.
**22.55, 23.20, 4.05, 4.30** Карына: дзікае сафары.
**23.50** Дзікія і небяспечныя.
**0.45** Кракадзілы-забойцы.
**1.35, 4.55** Паліцыя Філадэльфіі — аддзел па абароне жывёл.
**6.35** SOS дзікай прыроды.

### ЗДАРОЎЕ

**5.00** Выдаткі вытворчасці.
**5.30, 20.30** Як Вы сябе адчуваеце?
**6.00** Гэта карысна ведаць!
**6.45** Энцыклапедыя памылак.
**7.00, 22.00** Памылкі здароўя.
**7.30, 22.30** Алкаголь, тытунь, наркотыкі.
**8.00, 23.00** Мужчынскія сакрэты.
**8.30, 23.30** Пра дыеты і не толькі.
**9.00** Я перамог гэты боль.
**9.30, 0.30** Спорт для дзяцей.
**10.00, 1.00** Дыета.
**10.15, 1.15** Што лечыць гэты доктар?
**10.30, 1.30** Колькі вам гадоў?
**11.00** Дыягназ невядомы.
**11.55, 2.55** Тэрапія.
**12.25, 3.25** Як прадоўжыць маладосць і захаваць энергію.
**12.55, 3.55** Найноўшыя дасягненні.
**13.30, 4.30** Што мы носім?
**14.05** Якасць жыцця.
**14.35** Гімнастыка.
**15.05** Гамеапатыя.
**15.40** Клетка.
**16.30** Я чакаю дзіця.
**17.00** Першая дапамога.
**17.15** Педыятрыя.
**17.45** Гісторыя хвароб.
**18.15** Шлях да здароўя.
**18.40** Дыягназ невядомы.
**19.30** Кабінет прыгажосці.
**20.00** Практыка здароўя.
**21.00** Доктар клоўн.
**21.30** Вялікая прабежка.
**0.00** Цела чалавека.
**2.00** Харчовыя дабаўкі.

### ТДК

**6.00, 7.50, 13.50, 16.55, 17.50, 18.50, 21.50** Парады ТДК.
**6.25, 9.00, 15.00, 21.20** Усё лепшае для вас.
**7.25, 12.00, 18.00, 21.00, 5.00** Ваш доктар.
**8.00** Добрай раніцы, каханая!
**10.00, 17.00** Красуня.
**11.00, 16.00, 20.00, 0.30** Ваш асабісты псіхолаг.
**13.00, 2.10** Нашы дзеці.
**14.00, 1.20** Твой дом.
**19.00, 22.50, 4.00** Люстэрка жыцця.
**22.00, 23.40** Сэксуальная рэвалюцыя.
**3.00** Гісторыя поспеху.

## ■ Як жывяце, землякі?

У РЭГІЁНЕ

Брэстчына

### ІНТЭРНЭТНАЯ СЛАВА ЗОІ І ВАЛЕРЫ

**Брат і сястра Зоя і Валерый Барысюкі з Бярозаўскага раёна сталі вядомыя далёка за межамі краіны**

Брат добра валодае рознымі музычнымі інструментамі, сястра мае голас і выконвае песні, прыпеўкі. У нашых вёсках шмат галасістых людзей, але іх не запрашаюць на расійскія тэлевізійныя каналы. А тут...

Слава звалілася як снег на галаву пасля таго, як у Зарэччы пагасцявалі расійскія родзічы. Адна са сваячак запісала выступленне брата і сястры на відэа і змясціла гэты ролік у інтэрнэце. Песня была з рэпертуару Алены Ваенгі. І колькасць праглядаў у сеціве адразу зашкаліла. Праз некаторы час пайшлі званкі. Вясковы дуэт запрасілі выступіць на канале НТВ. Зоя і Валерый з'ездзілі ў Маскву. А перад самым Новым годам у расійскую сталіцу самадзейных артыстаў запрасіў Андрэй Малахаў — яны зняліся ў праекце «Сёння вечарам». Следам пацягнуліся беларускія тэлеканалы. Зарэчанскі дуэт, яшчэ месяц-другі таму нікому не вядомы, набірае ўсё большую папулярнасць. Цяпер паклоннікі Зоі і Валерыя праз інтэрнэт нават збіраюць грошы і робяць ім падарункі. А яны толькі і паспяваюць запісваць прапановы. Вось і Генадзь Хазанаў запрасіў іх выступіць у сваім Тэатры эстрады.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

### ВЯРТАННЕ БУРАГА

**Ці вернецца самы буйны драпежнік у Белавежскую пушчу?**

У студзені гэтага года завяршаецца распрацоўка праекта па рэінтрадукцыі бурага мядзведзя ў лясныя экасістэмы Белавежскай пушчы. Прапановы па вяртанні ў пушчу касалапага былі ініцыяваны летась у рамках сумеснага праекта Нацпарку, грамадскага аб'яднання «Ахова птушак Бацькаўшчыны» і Навукова-практычнага цэнтра па біярэсурсах Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Пытанне рэінтрадукцыі бурага мядзведзя ў пушчу даволі складанае і патрабуе ўважлівага вывучэння ўсіх аспектаў праблемы. У тым ліку неабходна ўлічваць і стаўленне да яго з боку насельніцтва, якое, што і казаць, адчувае страх перад гэтым драпежнікам. З іншага боку, на поўначы Беларусі зараз жыве каля 120 асобін мядзведзя, але за апошнія 60 гадоў не зафіксавана ніводнага выпадку нападу іх на чалавека.

Увянчаецца поспехам спроба інтрадукцыі мядзведзя ў пушчу на гэты раз і ці будзе наогул зроблена такая спроба? Супрацоўнік Цэнтра па біярэсурсах НАН Беларусі, доктар біялагічных навук Вадзім Сідаровіч, які займаецца навуковай распрацоўкай праекта, лічыць, што пры дбайным навуковым падыходзе і наяўнасці добра падрыхтаваных кадраў рэінтрадукцыя мядзведзя можа аказацца паспяховай:

— Аднак гэта доўгачасовы, магчыма, на 5-8 гадоў, праект, які павінен ахапіць не толькі Белавежскую пушчу, але і суседнія лясныя масівы, — лічыць вучоны. — Акрамя таго, праект гэты досыць дарагі, і яго рэалізацыя патрабуе вялікіх ведаў і вопыту.

**Сяргей МЯДЗВЕДЗЕЎ.**

Віцебшчына

### ПОМНІК КНЯЗЮ АЛЬГЕРДУ

**Князю Альгерду, пры якім Віцебск вельмі мацнеў і актыўна развіваўся ў XIV стагоддзі, у горадзе над Заходняй Дзвіной паставяць помнік**



Аўтарам ідэі ўстаноўкі помніка князю Альгерду з'яўляецца віцебскі губернатар Аляксандр Косінец. Ён неаднаразова гаварыў аб тым, што Віцебску патрэбны помнікі людзям, якія яго праславілі, або дзякуючы якім горад актыўна развіваўся і мацнеў.

Конкурс эскізаў помніка Альгерду правялі ў 2010 годзе. Перамог вядомы віцебскі скульптар Валерый Магучы. У тым ліку ён зрабіў помнік мастаку Марку Шагалу «Віцебская мелодыя на французскай скрыпцы», помнік стваральніку электрычнага трамвая Ф.А. Піроцкаму і іншыя. Дарэчы, скульптар таксама з'яўляецца аўтарам Гран-пры і іншых «сланоў» (прызоў) міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар».

Яшчэ ў Віцебску плануюць паставіць помнікі знакамітаму князю Аляксандру Неўскаму і княжне Вользе, якая, згодна з легендай, з'яўляецца заснавальніцай Віцебска.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Гродзеншчына

### ПАНСКІЯ СЯДЗІБЫ НАБЫВАЮЦЬ НОВЫХ ГАСПАДАРОЎ

**Старадаўняя сядзіба Чачотаў-Бохвіцаў у Ваўкавыскім раёне прададзена за 120 тысяч долараў**



Расійскі бізнэсмен Павел Падкарытаў мае намер адкрыць тут агратурыстычны цэнтр з атэлем, музейным комплексам, карчмой. Аб'ект, які прызнаны гісторыка-культурнай каштоўнасцю, першапачаткова ацэньваўся ў 971,5 мільёна рублёў. А прадалі яго за 1млрд 20 млн. Як паведаміў галоўны спецыяліст аддзела культура Ваўкавыскага райвыканкама Сяргей Урбановіч, з 1996 да 2010 года панскі комплекс належаў калгасу «Падораск». З 2002-га галоўны будынак пуставаў і паступова прыходзіў у заняпад. Дарэчы, некалькі гадоў таму іншы расіянін набыў сядзібу ў Красках прыкладна за 100 тысяч долараў.

**Віталь ГЛУХОЎСКІ.**

Магілёўшчына

### ЖЫХАРЫ БЫХАВА ЗБІРАЮЦЬ ГРОШЫ НА ЗАМАК

**Для аднаўлення старажытнага Быхаўскага замка патрабуюцца грошы**

Райвыканкам адкрыў дабрачынны рахунак, каб прыцягнуць сродкі спонсараў і грамадзян. Асноўныя выдаткі возьме на сябе дзяржава, але дапамога неабыякавых людзей таксама не пашкодзіць.

Як вядома, сёлетні Дзень пісьменства адбудзецца ў Быхаве. Замак Сапегі на высокім вале каля Дняпра ўпрыгожвае горад, і да восені мяркуецца навесці там парадак і пачаць аднаўленчыя работы ў гэтым помніку архітэктуры XVII стагоддзя. У 2013 годзе па дзяржаўнай праграме на Быхаўскі замак будзе выдаткавана 1,5 млрд рублёў, і большая частка гэтых грошай пойдзе на распрацоўку праекта па рэстаўрацыі гістарычнага будынка. Плануюцца археалагічныя раскопкі. Канчаткова аднавіць замак плануюць у 2018 годзе.

Дабрачынны рахунак у беларускіх рублях №364 204 579 4327 ЦБУ №706 філіял №700 Магілёўскага абласнога ўпраўлення ААТ «ААБ Беларусбанк». МФО 153 801 536; УНП 700 085 055.

**Ілона ІВАНОВА.**

Міншчына

### СМЕЛЫ СТУДЭНТ

**Пяцікурсніка ўзнагародзяць за выратаванне дзяцей з палаючага дома**

У Маладзечне студэнт пятага курса аднаго з каледжаў Бабруйска Яўген Мацуцін выратаваў на пажары дваіх дзяцей. Мінскае абласное ўпраўленне МНС мае намер узнагародзіць маладога чалавека грашовай прэміяй або каштоўным падарункам.

У аднапавярховым драўляным доме двое дзяцей 1999 і 2004 гадоў нараджэння ў апошні дзень зімовых канікул праводзілі на кухні «эксперымент» з лёгкаўзгаральнай вадкасцю і запалкамі, у выніку чаго ўзнік пажар. Дзеці паспрабавалі патушыць яго, але, калі зразумелі, што самім з агнём ім не справіцца, выклікалі выратавальнікаў. Пры гэтым браты сталі крычаць, клічучы на дапамогу. 20-гадовы Яўген Мацуцін, які праходзіў міма, і выцягнуў іх праз акно.

Падраздзяленні МНС, якія прыбылі па выкліку, ліквідавалі ўзгаранне за некалькі хвілін. Адзін з хлопчыкаў атрымаў апёк галёнкі першай ступені. Пацярпеў ад агню і выратавальнік-студэнт.

**Сяргей ДРУЖЧЫЦ.**


## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ ИНДИВИДУАЛЬНОГО ЖИЛИЩНОГО СТРОИТЕЛЬСТВА.

**Продавец — Раковский сельский исполнительный комитет Воложинского района Минской области**

| Лот | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок в агрогородке Раков, ул. Весенняя, 32 площадью 0,1546 гектара | Кадастровый номер участка 622085715632000039. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Имеется возможность подключения электричества, водопровода и природного газа. | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 2 | Земельный участок в деревне Михалово, ул. Полевая, 146 площадью 0,1600 гектара | Кадастровый номер участка 622085711601000161. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Новый район застройки. Удалённость от аг. Раков 5 километров. | 14 000 000 | 1 400 000 |
| 3 | Земельный участок в деревне Стражевщина, 1 А площадью 0,1500 гектара | Кадастровый номер участка 622085718101000019. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Имеются подъездные пути, электричество. Расстояние от аг. Раков 12 километров. | 10 000 000 | 1 000 000 |
| 4 | Земельный участок в деревне Кучкуны, ул. Бородинская, д. 44 площадью 0,1500 гектара | Кадастровый номер участка 622085708601000268. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Имеются подъездные пути, электричество, водопровод. Удалённость от аг. Раков 4 километра. | 22 000 000 | 2 200 000 |
| 5 | Земельный участок в деревне Шаповалы, уч. 21а площадью 0,1500 гектара | Кадастровый номер участка 622085719601000039. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Имеется электричество, подъездные пути. Удалённость от аг. Раков 20 километров, от г. Заславль — 8 километров. | 22 000 000 | 2 200 000 |

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории Республики Беларусь или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10% от начальной цены перечисляется квитанцией на расчётный счёт госказначейства № 3600614140501 Главное управление МФ РБ по Минской области в ЦБУ № 605 г. Воложин, филиал № 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 153001601, УНП 600537220. Код платежа 04901.

**Аукцион состоится 15 февраля 2013 года (пятница) в 10.00 по адресу: агрогородок Раков, площадь Свободы, д. 11, 2-ой этаж; зал заседаний. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются до 11 февраля 2013 года (включительно) до 17.00 по адресу: агрогородок Раков, площадь Свободы, д. 11, кабинет управляющего делами исполкома.**

Оплата по результатам аукциона должна быть произведена в десятидневный срок со дня подписания протокола.

**Контактные телефоны (8 01772) 30 305; 8029 1405437.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Аукцион состоится 15.02.2013 г. в 11.00 по адресу: 220049, г. Минск, ул. Севастопольская, 121, каб. 213 (студия).**

**Организатором аукциона является РУП «Белтелеком» в лице филиала «Междугородная связь» РУП «Белтелеком», находящегося по адресу: г. Минск, ул. Севастопольская, 121.**

На аукционе выставляется право заключения договоров аренды недвижимого имущества:

**Лот № 1**. Отдельное помещение (гаражный бокс) в капитальном строении (склад-гараж 2-й группы), расположенном по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Качана, 15, удовлетворительного состояния, общей площадью 73,0 кв.м, срок аренды – не менее 3-х лет; начальная цена продажи – 18,25 базовой величины, размер задатка – 1,825 базовой величины; целевое использование – для производственных площадей (за исключением вредных производств), складских помещений, оказания услуг; коэффициент (п.8.2 Указа №150) составляет 3,0.

**Лот № 2.** Отдельные помещения в капитальном строении (склад-гараж 2-й группы), расположенном по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Качана, 15, удовлетворительного состояния, общей площадью 345,3 кв.м (отдельные помещения: 15,7 кв.м, 2,6 кв.м, 2,7 кв.м, 5,0 кв.м, 319,3 кв.м), срок аренды – не менее 3-х лет; начальная цена продажи – 86,325 базовой величины, размер задатка – 8,6325 базовой величины; целевое использование – для производственных площадей (за исключением вредных производств), складских помещений, оказания услуг; коэффициент (п.8.2 Указа №150) составляет 3,0.

**Документы на участие в аукционе принимаются с 14.01.2013 г. по 14.02.2013 г. в рабочее время (с 9.00 до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. Севастопольская, 121, каб. 407. Документы, поданные после 16.00 14.02.2013 г., не рассматриваются. Заключительная регистрация участников аукциона в день проведения аукциона с 9.00 до 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Севастопольская, 121, каб. 407.**

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049.

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе:

- перечисляет задаток на с/с № 3012365460012 в филиале №529 «Белсвязь» ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 720, УНП 100185356, филиал «Междугородная связь» РУП «Белтелеком»;
- подает заявление на участие в аукционе;
- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

- физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;
- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации;
- юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

Срок заключения договора аренды: в соответствии с действующим законодательством.

**Телефоны для справок: (017) 269 20 94, 269 20 34, факс (017) 269 20 03.**

## ООО «Арбитр», управляющий по делу о банкротстве – организатор торгов, СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА Волковысского ОАО «ПМК-Строй»:

| № лота | Наименование лота | Начальная цена продажи лота | Шаг торгов | Задаток |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Здание административно-бытового корпуса общей площадью 242 м², с канализационной сетью, водопроводной сетью, кабельной линией электропередач, теплотрассой, ж/б забором длиной 239,12 м с воротами, и дворовым покрытием площадью 282,5 м² | 475 778 604 р. | 23 788 930 р. | 23 788 930 р. |
| | Одноэтажное кирпичное здание пилорамы с подвалом (3А1/к) общей площадью 115,4 м² | | | |
| | Одноэтажное кирпичное здание бетоносмесительного отделения общей площадью 100 м² | | | |
| | Одноэтажное кирпичное здание складов с одноэтажной кирпичной пристройкой (5А1/к) общей площадью 446,8 м², с кирпичной уборной (7А1/к) общей площадью 2,2 м², и кирпичным сараем (8А1/к) общей площадью 4,4 м² | | | |
| | Одноэтажное кирпичное здание-бытовка, с одноэтажной блочной пристройкой (4А1/к) общей площадью 119,1 м² | | | |
| | Здание столярного цеха с мехмастерскими (Б1/к) общей площадью 547 м² с котельной и котлом КВ-95 | | | |
| | Одноэтажное кирпичное здание бетоносмесительного узла общей площадью 51,2 м² | | | |

Торги проводятся в форме аукциона, открытого по составу участников и по форме подачи предложений о цене.

**Торги состоятся 23 января 2013 года в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Солнечная, 5.**

До подачи заявки Претенденту необходимо перечислить задаток в безналичном порядке по следующим платежным реквизитам: Волковысское ОАО «ПМК-Строй», р/с 3012202200013 в ОАО «Белагропромбанк» отделение в г. Волковыск, код 152101446, УНП 500042773.

Заявления на участие в аукционе с приложением платежного поручения, подтверждающего внесение задатка, а также: для юридических лиц – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации, устава; для индивидуального предпринимателя – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица – копии паспорта, принимаются с момента выхода настоящего объявления **до 11.00 22.01.2013** по адресу: 230001, г. Гродно-1, а/я 27 или по факсу 8(0152) 526859.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки. После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 дней после подписания протокола. В соответствии с п. 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

Настоящее объявление содержит лишь общие характеристики предмета торгов и условий его реализации. Получить полную информацию о порядке и условиях проведения торгов, о предмете торгов можно в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Гродно, ул. Солнечная, 5, тел. 8(029)7831160, тел./факс 8(0152)526859. Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: Гродненская область, г. Волковыск, ул. Октябрьская, д. 151.

## ИЗВЕЩЕНИЕ

Государственное производственное объединение «МИНСКСТРОЙ»

**ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ДОЛЬЩИКОВ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ НЕЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ ОБЪЕКТА «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-3. Жилой дом № 13 по генплану» в г. Минске,**

*опубликованную в газете «Звязда» от 22 марта 2011 года № 52:*

Ожидаемый ввод в эксплуатацию нежилых помещений, расположенных во 2 – 9 пусковых комплексах жилого дома – 01 мая 2013 года.

Дополнительные соглашения о переносе сроков окончания строительства будут заключаться в кабинете 105 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А.

*Генеральный директор* *Н.В.Милошевский*

УНП 100071325

## ИЗВЕЩЕНИЕ

Государственное производственное объединение «МИНСКСТРОЙ»

**ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ДОЛЬЩИКОВ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ ОБЪЕКТА «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-6. Жилой дом № 17 по генплану»** в г. Минске,

*опубликованную в газете «Звязда» 7 июня 2012 года:*

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений без учета выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет – 8 976 299 руб. – на 1-комнатные квартиры; 8 668 263 руб. – на 2-комнатные квартиры; 8 360 227 – на 3-комнатные квартиры.

Дополнительные соглашения об изменении стоимости будут заключаться в кабинете 105 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А.

*Генеральный директор* *Н.В.Милошевский*

УНП 100071325

**Частное торговое унитарное предприятие «Лидок» (УНП 690609673) объявляет о начале процесса реорганизации в форме преобразования в Общество с ограниченной ответственностью «Лидок».** Претензии кредиторов принимаются в течение 1 (одного) месяца на почтовый адрес: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, п. Городище, ул. Тенистая, д. 20.

**ФСООО «Белкоопстрах» в г. Минске информирует о признании недействительными:**

- страховые полисы по договорам страхования, заключаемые с физическим лицом (Форма 2РН), юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем (Форма 2РП) по страхованию иному, чем страхование жизни формы 2РН, 2РП серии БК №№ 0107533—0107540;
- страховые полисы по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездок за границу формы 2РН, 2РП серии БМ № 0313092.

В публикации о проведении ОАО «ЭнКоСтрой» дополнительного выпуска акций (газета «Звязда» № 248 от 27 декабря 2012 г.) номинальную стоимость **85 (восемьдесят пять) рублей** следует считать номинальной стоимостью **85 465 (восемьдесят пять тысяч четыреста шестьдесят пять) рублей.** УНН 191303197

*Установа адукацыі*

**«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ»**

## АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС на замяшчэнне наступных пасад:

- ■ кафедра псіхалогіі і педагогікі: **дацэнт**;
- ■ кафедра беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры: **прафесар**;
- ■ кафедра замежных моў: **дацэнт; старшы выкладчык** (2);
- ■ кафедра тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый: **дацэнт**;
- ■ кафедра менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы: **дацэнт** (2);
- ■ кафедра інфармацыйных рэсурсаў: **дацэнт**;
- ■ кафедра гісторыі Беларусі і музеязнаўства: **дацэнт**;
- ■ кафедра культуралогіі: **старшы выкладчык, прафесар**;
- ■ кафедра менеджмента сацыяльна-культурнай дзейнасці: **выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт, прафесар**;
- ■ кафедра педагогікі сацыякультурнай дзейнасці: **дацэнт** (2), **загадчык кафедры**;
- ■ кафедра міжкультурных камунікацый: **дацэнт**;
- ■ кафедра інфармацыйных тэхналогій у культуры: **старшы выкладчык, дацэнт, загадчык кафедры;**
- ■ кафедра мастацтва эстрады: **выкладчык** (3);
- ■ кафедра харавога і вакальнага мастацтва: **выкладчык, дацэнт** (2), **прафесар**;
- ■ кафедра народна-інструментальнай творчасці: **выкладчык, дацэнт** (2);
- ■ кафедра духавой музыкі: **старшы выкладчык, дацэнт**;
- ■ кафедра беларускай народна-песеннай творчасці: **выкладчык, дацэнт** (2);
- ■ кафедра рэжысуры эстрады: **загадчык кафедры**;
- ■ кафедра этналогіі і фальклору: **старшы выкладчык**;
- ■ кафедра тэатральнай творчасці: **выкладчык, дацэнт**;
- ■ кафедра рэжысуры абрадаў і святаў: **старшы выкладчык, дацэнт** (2);
- ■ кафедра народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: **выкладчык, дацэнт**;
- ■ кафедра харэаграфіі: **дацэнт** (2);
- ■ кафедра рускай мовы як замежная: **выкладчык** (2), **загадчык кафедры.**

**Наш адрас: 220001, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17. Аддзел кадраў.**

УНП 100286677

22 января 2013 г. в 16.30 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Чернавчицкий завод ЖБИ».

Повестка дня:

1. Об изменении размера уставного фонда Общества.
2. О внесении и утверждении изменений в Устав Общества.

Местонахождение ОАО «Чернавчицкий завод ЖБИ»: Брестский р-он, д. Чернавчицы, ул. Трудовая, 1Г.

Место проведения собрания: Брестский р-он, д. Чернавчицы, ул. Трудовая, 1Г.

Время регистрации в день проведения собрания с 15.30 до 16.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 15.01.2013 г. (с 10.00 до 16.00) по месту нахождения Общества.

Наблюдательный совет.

УНП 200034706

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в деревнях Дуброва, Багута, Батуринка Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области**

| | | |
|---|---|---|
| 1. | **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| 2. | **Дата, время и место проведения аукциона** | **15 февраля 2013 года в 11.00,** аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Озерицко-Слободской сельисполком, зал заседаний |
| 3. | **Продавец и его адрес** | Озерицко-Слободской сельисполком, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27 |
| 4. | **Земельный участок, его кадастровый номер и адрес** | Лот № 1 — площадь 0,1489 га № 624883003801000256, д. Дуброва. Лот № 2 — площадь 0,2000 га (по генплану № 6) № 624883000601000078, д. Багута. Лот № 3 — площадь 0,1950 га (по генплану № 7 квар. 1), № 624883001101010000183, д. Батуринка |
| 5. | **Условия продажи** | Без изменения целевого назначения |
| 6. | **Целевое назначение земельного участка** | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 7. | **Начальная (стартовая) цена продажи** | Лот № 1 — 35 000 000 рублей<br>Лот № 2 — 60 000 000 рублей<br>Лот № 3 — 100 000 000 рублей |
| 8. | **Условия аукциона** | А) продажа по цене не ниже начальной;<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь |
| 9. | **Наличие инженерной инфраструктуры** | д. Дуброва — нет, д. Багута — подъездная дорога, электроэнергия, д. Батуринка — подъездные дороги |
| 10. | **Условия оплаты** | За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11. | **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 10% от начальной (стартовой) цены земельного участка р/с 3641000000058 ЦБУ 621 г. Смолевичи, филиал № 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, код 812, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок»). УНП 600046563 (МФО 153001812) |
| 12. | **Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками** | Каждый вторник в 10.00 |
| 13. | **Прием документов** | В рабочие дни: понедельник, вторник, среда, четверг, пятница с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| 13. | **Окончательный срок приема документов** | **11 февраля 2013 года в 17.00** |
| 14. | **Контактный телефон** | 8 01776 44 636, 68 030 |

Расходы по организации и проведению аукциона, затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков).
3. Физическим лицам — документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

■ Лініі жыцця

# КАЛІ ЎСЕ ДОМА

**...Летам яны сходзяцца ці не ўсе і амаль штодня (ля пад'езда зручныя лаўкі), зімой — зрэдчас, у кагосьаднага. І тады ўжо гутаркі — як вады! Ды і гутарка, як вада, — пра ўсё. Напрыканцы, нязменна, пра тое, як жа цяжка жыць ім, нямоглым, старым, ды з дарослымі дзецьмі.**

**Не скардзіцца на гэта толькі Антонаўна — яна... усміхаецца і ідзе дамоў.**

❍ ❍ ❍

...Пра тое, што ў сына нехта з'явіўся, здагадацца было не цяжка. Ну хаця б па тым, што хлопец, рыхтуючы сабе «тармазок», больш не палавініў (уздоўж) бохан хлеба, не прымінаў мякіш і не пакаваў туды ўсё, што ўлезе (рэшткі плову, сардэлькі, катлеты, гуркі...). Цяпер ён старанна нарэзваў батон на лустачкі, кожную намазваў маслам, потым гусценька «ўсцілаў» — выключна каўбасою ды сырам...

І тэрмас кітайскі з секцыі выцягнуў (чай з сабой стаў заварваць), прысмакі да яго ў пакецік складаць...

«Хай, — пасміхалася маці, — было б чаго шкадаваць — пасля арміі хлопец, трэба ўжо, каб нехта з'явіўся: тая ж жонка, дзеці, сям'я...» Праўда, як для яе, для маці, лепш, каб гэта — спачатку ў дачкі, бо яна старэйшая. Але ж тут нічога не папішаш — у дзеўкі доля такая: яна ідзе замуж, калі бяруць... Гэта хлопец жэніцца, калі хоча...

Адно — каб з людскай якой...

Выпытвала маці, хто яна і адкуль. Сын аднекваўся, але ж сакрэты свае пакрысе «здаваў». Сказаў, што абраніцу завуць Таццянай («Таняй... Прыгожа», — прызнала маці), што яна на два гады старэйшая («Дрэнна!»...), што скончыла вучылішча («Лепш, вядома, каб інстытут»...), што працуе, можна сказаць, поруч — у суседнім цэху («То, відаць, зарабляе?»...), што жыве ў заводскім інтэрнаце, бо родам з вёскі...

Карацей, штось з пачутага маці падабалася, штось, мякка кажучы, не вельмі... Але з гэтым яна, можа, і змірылася б, калі б...

Калі б на той дзеўцы (чыста знешне) хоць нешта было. А то ж, як высветлілася (у нядзелю сын дадому прывёў), ні самім паглядзець, ні людзям паказаць: ні да бока яна, ні да вока. Ён — волат, можна сказаць! Яна ж — нейкая зблажэлая, малая, худая, хоць есць — не раўнуючы — як з галоднага краю, ну ўсё, што ні дай! А ў завяршэнне абеду яшчэ і падчыстую — літаральна: скарыначку ў руку і па талерцы ёю...

У маці ад гэткага відовішча аж ціск падскочыў: схапілася за галаву, моўчкі сышла ў свой пакой...

Заспяшалася дамоў і кандыдатка ў нявесткі. Прапанавала, праўда, посуд перамыць. І з вітальні падзякавала — ціха, але так, каб маці пачула, — за гасцінны прыём. Сказала, што ўсё было вельмі смачна, папрасіла прабачэння, калі нешта не так — з яе боку...

Сын, вядома ж, госцю праводзіў. І, хоць недалёка зусім (толькі да прыпынку, бо маці ж нядобра), тая, калі ён вярнуўся, ужо ніякай была — наглытаўшыся лекаў, просам прасіла:

— Віталік, хлопчык мой, адумайся! Паглядзі ў люстэрка — які ты і якая яна! Разуй свае вочы, бо анічога ж на ёй...

— Яна добрая, — спрабаваў заступіцца сын, але ж маці не чула — гнула сваё:

— ...Нейкая, мусіць, сухотная, хворая... І галата ж галатой! Ты бачыў, як яна ела?.. А як талерку пачысціла?

— У іх, у інтэрнаце, вады гарачай няма...

— ...І сукенку ў некага, мусіць, пазычыла — завялікая...

— Гэта я ёй выбраў... Яна табе спадабацца хацела.

— ...А ўсё дзеля чаго? — аблівалася слязамі маці. — Каб акруціць цябе, ёлупня, каб мазгі табе, дурню, запудрыць, каб пішчом у сям'ю нашу ўлезці.

— З чаго ты ўзяла?..

— Дык на ёй жа напісана, што нічога не мае, што душу аддасць, каб прапісацца тут ды загаспадарыць... А потым метры адсудзіць. Але ж дудкі! Не на тых нарвалася!.. Каб нагі яе ў маім доме не было! Чуеш?..

Сын (маці гэта ведала) шкадаваў яе і, як правіла, слухаўся. Праўда, цяпер чамусьці маўчаў, не ішоў на папятную: злы, чырвоны, як рак, ён усяго толькі і выціснуў, што: «Супакойся, табе нельга хвалявацца. Я... падумаю».

Маці гэтых слоў было дастаткова. Ну сапраўды ж: сын у яе не дурны, не! І не вораг — ні ёй, ні, тым болей, сабе... Значыць, падумаўшы, павінен зразумець, што дзяўчат вакол — безліч: маладых, прыгожых, адукаваных, з кватэрамі, з машынамі, што за яго (хлопец без заган!) — можа пайсці любая, а вось, гэта, галапузая, змарнелая, яму проста не пара. Таму ён, ну вядома ж, знойдзе нейкі спосаб — парве адносіны... І ёй жа, матулі, потым падзякуе, што спыніла яго — не дазволіла дурной жаніцьбы.

Аднак не, зусім не гэтага яна дачакалася: у заводскім інтэрнаце, дзе жыла Таццяна, ім... абяцалі пакой.

— І ты пойдзеш туды, у гэты «гадзюшнік», у гэты мурашнік? — зноў крычала маці. — Казармы табе не хапіла? Думаеш, год-два пажывеш як паслужыш, а потым дадому? Дык жа не, дудкі: альбо заставайся — цяпер, альбо сыходзь. Але ж ведай тады, што я не дарую і назад не прыму! Хоць на каленях паўзі... Жыві ў сваім шалашы... Калі не ўсе дома...

— А яно ж і праўду — не ўсе. Жонкі няма, — усміхнуўся сын і... забраў свае рэчы.

❍ ❍ ❍

Вяселля яны не спраўлялі: ціха распісаліся, з ЗАГСа зайшлі ў кавярню — разам са сведкамі ды самай блізкай раднёй, праўда, з боку нявесты.

З боку жаніха сваякоў не было: маці з сястрой аб'явілі байкот — не прыйшлі... Ні ў той ЗАГС, ні потым у радзільню, дзе праз восем месяцаў на свет з'явіўся іх першынец, а праз тры гады — і двое блізнят-дзяўчынак.

Пасля гэтага ім ужо асобную кватэру далі: сваю, з усімі выгодамі, з прасторнай кухняй, з дзвюма лоджыямі...

З гэткай вялікай радасці нельга было ўлазін не справіць! Бо хацелася ж запрасіць радню ды сяброў (пераважна — суседзяў па былым «мурашніку», што заўсёды выручалі іх то з дзецьмі, то з грашыма, то з лекамі-прадуктамі)...

Але гэта — па-другое ці нават патрэцяе: спачатку яны (дзівакі ж!) хацелі даказаць радні, што жывуць не горай за іншых, што маюць ледзь не ўсё неабходнае (а цяпер і сваю жылплошчу!), што не прэтэндуюць ні на якія клятыя «метры»...

Галоўнае ж — яны марылі паказаць дзяцей, бо лічылі, што гэта проста ненармальна, не па-людску, калі родная бабуля, родная цётка, жывучы ў адным горадзе, не ведаюць іх, такіх прыгожых і разумных, не бачыць, як яны растуць...

Са скуры тады вылузваліся — каб стол накрыць, як належыць, каб годна прыняць.

Аднак марна стараліся: самыя чаканыя з усіх запрошаных (маці і сястра гаспадара) у новую кватэру не прыйшлі.

❍ ❍ ❍

...Тое, што з мужам нешта не так, жонка зразумела адразу — па адсутным позірку, па крыку на дзяцей, па бяссонні ноччу. Колькі разоў выбірала моманты, пыталася: можа, на працы што? Можа, захварэў? Маўчаў... І чарнеў... Чарнеў... І маўчаў. Здаўся перад святамі. Сказаў:

— Мне з бальніцы званілі. Маці там...

— І ты скрываў?! — жахнулася жонка.

— ...Перанесла інсульт, — не слухаў яе Віталь, — не ўстае. Кажуць, наўрад ці ўстане...

— Дык паехалі! Можа, трэба што!

— Не, я там быў. І сястра спачатку хадзіла... А як забіраць, — сказала, не можа.

— Як гэта?

— Ды так! Дактарам нагаварыла, што ў яе пасада, што няма калі дагледзець, што муж супраць...

— Ён што — з'явіўся?

— Маці кажа — не... А самой яе няма — ні дома, ні на рабоце... Усе тэлефоны маўчаць.

— Дык, можа, з ёй што зрабілася?

— Не... Яна палатнай дакторцы эсэмэску прыслала — з маімі тэлефонамі.

— Ну і добра, — уздыхнула Таня, — значыць, маму забярэм мы.

— Табе мала траіх малых? Ты яшчэ ляжачую на плечы ўзваліш? — узарваўся раптам Віталь.

— Дык гэта ж маці...

— Яна ведаць цябе не хацела...

— Ну і што?

— Яна ў цябе ў гасцях ні разу не была...

— Яе права...

— Яна дзяцей нашых не бачыла! Яна ім за столькі гадоў аніводнай цацкі, ніводнай цукерчыны...

— А яны не абышліся? Бедныя? Цацак не маюць? Цукерак у вочы не бачылі?

— Гэта не ўсё, — праз паўзу і ўжо кудысьці цішэй прамовіў Віталь. — Я табе не казаў, не хацеў яшчэ болей крыўдзіць... Маці дароўную аформіла: сястры адышлі і наша кватэра, і дача — усё...

— Ну і ліха з ім... Дачка ж да маці заўсёды бліжэй... А што забіраць не хоча — дык Бог ёй суддзя. Можа, потым перадумае? А не — дык і гэта не бяда. Нас жа многа, мы загартаваныя — справімся, вось пабачыш! Каб толькі сама яна пагадзілася... Ты пагавары з ёй. А так кватэра вялікая, ціхая, першы паверх, вокны ў сад. Як у санаторыі тут будзе! Мы і пакой ёй выдзелім.

❍ ❍ ❍

...У пятніцу перад абедам хворую асцярожна (бо спала... Ці выгляд рабіла?) укацілі ў кватэру, у той асобны пакой — паклалі на спецыяльны ложак, у чыстую пасцель.

Праз паўгадзінкі (трэба ж даць асвоіцца?) да яе зазірнуў сын — прынёс міску пахкай кашы і кубак цёплага кісялю. Пакарміў, папытаўся, ці не мулка ляжаць.

Следам зазірнула нявестка — прынесла яшчэ адну падушку, паклала бліжэй пульт ад тэлевізара, сказала, што ён добра ідзе і шмат каналаў.

За ёю ўваліўся ўнук — з прапановай:

— Бабуля, давай я табе пачытаю? А ты ў гэты час, калі хочаш, паспі, пакуль малыя ў садку, бо яны, бывае, шумяць.

«Накаркаў» — хвілін праз колькі ў дзвярах з'явіліся ўнучкі: аднолькавыя, як дзве лялькі, ёй лялек прынеслі:

— Бабуля, на — паглядзі!

Яна хацела паглядзець (найперш на блізнятак!), расплюшчыць вочы, але ж з іх ці не ў два ручаі тады паліліся б слёзы.

— Я потым, — прашаптала яна ўнучкам і адвярнулася — да сцяны, да акна. За якім (якраз як на дачы!) стаялі старыя пакручастыя яблыні. І ў хворай — першы раз за апошнія тыдні — мільганула думка, што добра было б дачакацца вясны. А яшчэ лепш — устаць, стаць на ногі, папраўіцца, каб хоць нешта паспець зрабіць — для гэтых дзяцей, для сына, для нявесткі... Каб яны даравалі ёй.

❍ ❍ ❍

...Ля пад'езда зручныя лаўкі. Летам старыя сядзяць там штодня, зімой — зрэдчас. І тады ўжо гутаркі — як вады! Ды і гутарка як вада: пра тое, як цяжка жыць ім з дарослымі дзецьмі, гавораць усе, апроч Антонаўны. Яна ўсміхаецца і сыходзіць. Да сваіх, на першы паверх. Гэта так блізка...

**Валянціна ДОЎНАР**




## СЕМЕНА — ПОЧТОЙ

Со своего огорода

**Много лет выращиваю овощи на своем огороде с минимальным поливом и без пленки. Отбираю самые урожайные и ценные, адаптированные к местным условиям, заготавливаю их семена, которые и предлагаю овощеводам-любителям.**

**Бахчевые.** Дыня **Белорусская ранняя** (до 4 кг). Арбуз **Бобруйский** – до 7 кг. В жаркие и теплые годы все созревают в августе.

**Тыквы. Титан –** чемпион среди тыкв, до 100 кг. **Кавбуз** – тыква мягкокорая, до 40 кг. **Витаминная** (очень вкусная, до 20 кг), **Зимняя сладкая** (до 20 кг.) и **Сдобная пышка** (до 10 кг) – все сладкие, мякоть оранжевая, хранятся всю зиму в доме, вкусен и полезен сок и каши из них.

**Кабачки. Ананасный** (оранжевые, кустовые), **Белый якорь** (белые, очень ранние). **Вьетнамский –** спелые очень сладкие, вкусные, с плотной оранжевой мякотью, долго хранятся.

**Огурцы.** ***Очень ранние –*** **Малыш.** ***Ранние –*** **Пальчик** (долго и обильно плодоносят). ***Ранне-средние –*** **Капелька, Конкурент, Славянские, Свитанак, Верасень.** Все огурцы мелкие, засолочные, устойчивые к болезням.

**Перец сладкий** скороспелый, урожайный: **Алеся –** красный, **Этюд –** желто-оранжевый; **Длинный –** красный, по форме плода как банан (до 20 см); ***томатного типа (круглые)*** – **Александр** (красные) и **Солнышко** (оранжевые).

**Помидоры.** ***Ультраранние*** (начало сбора 5-10 июля, куст до 60 см) **– Альфа** и **Чиполлино** (оба по 50 гр.), **Женечка –** красные, 80 гр., **Майская роза –** розовые, до 100 гр., лежкие, **Золотое сердце –** желтые, плотные, до 200 гр.

***Ранние, низкие –*** **Красная шапочка** (80 гр., очень урожайные, идеальны для закатки); **Подарок брата (**60-70 гр.) и **Вилина** (80 гр.) – оба вкусные, урожайные, наиболее устойчивые к фитофторозу**; Павловская роза –** 120 гр., розовые, сладкие; **Ляна, Ротон –** оба до 70 см, 80-120 гр., красивые, плотные, по ведру плодов с куста, с повышенной устойчивостью к фитофторозу; **Мисс Америка –** плоды плотные, отличный вкус, долго хранятся. **Первая любовь –** розовые, до 400 гр., с картофельной ботвой, куст – 80 см.

***Холодостойкие,*** низкие, ранние – **Снежная королева** (120 гр., хорошо переносит засуху, устойчива к болезням)**; Сибиряк –** до 200 гр.

***Среднеспелые, низкие:*** **Призер, Стрелка** (остроносые) – 40-60 гр. закаточные, долго хранятся свежими, **Талаш –** до 250 гр., вкусные, урожайные**;** ***среднерослые,*** *куст 80 см***: Джина** (красные, 250 гр., красивые), **Лисичка –** 120 гр., оранжевые, сладкие, лежкие, хороши для закатки, **Дина** (плоды желтые, как хурма, плотные,); **Мулат –** очень урожайные, коричневые, 90 гр., по форме – куриные яйца.

***Крупноплодные,*** куст 1 м: **Тещина радость** (розовые)**, Золотые купола** (желтые) – оба до 1 кг; **Десертный розовый –** до 500 гр.; **Черный принц** (вкусные) и **Оранж** (желто-оранжевые) – оба до 300 гр., **Бычье сердце –** до 600 гр., **Райское наслаждение –** розовые, 400 гр.

***Тепличные*** они же хороши и для гряд (высокие): **Красная стрела –** очень вкусные, 80-120 гр.; **Славянский шедевр** (красные, вкусные, лежкие, плотные до 500 гр.), **Сердцеед** и **Грейпфрут** (сладкие) – оба до 1 кг. **Медовая капля** – желтые, 30 гр., необычайно сладкие. **Ягодное лукошко –** смесь сортов «Черри».

***Высокие для гряд – с высокой устойчивостью к фитофторозу*** – **Де-Барао: красный, желтый, черный.**

**Комнатные овощи** украсят любой подоконник: **Помидорки: Смесь сортов –** компактный кустик 30 см, плоды красные, желтые, оранжевые(15-20 гр.); **Балконное чудо** (30-40 гр.) – раннеспелый, куст 60 см. **Острый перчик Эпка –** декоративен круглый год, используется как приправа.

Семена расфасованы: помидоры и перец по 30 шт. и более (комнатные 15 шт.), огурцы по 30-35 шт., все остальные – по 10-17 шт. Высылаю наложным платежом 5 тыс. рублей за пакет. За каждые 10 заказанных пакетов – высылаю **бесплатно 2** и более пакетов (укажите, что именно) и свою **Агротехнику** выращивания. От Вас жду письмо-заказ. Свой адрес и Ф.И.О. пишите **полностью** и **разборчиво**. Оплата при получении семян на почте.

**Мой адрес: 213803, Могилевская обл., г. Бобруйск, 3. До востребования ПРОКОПЧИКУ Виктору Павловичу.**


■ Паслясвяточнае

## ПАДЗАРАБІЦЬ НА ЕЛКАХ НЕ АТРЫМАЛАСЯ

**У перадНавагоднія дні ў лясах краіны дзяржаўнай лясной аховай разам з іншымі кантралюючымі органамі былі выяўлены 32 выпадкі незаконных высечак хвойных дрэў. У парушальнікаў было канфіскавана 225 елак, з іх 158 штук — у аднаго парушальніка ў Віцебскай вобласці.**

У выніку незаконных высечак лясному фонду нанесена шкода на 3,3 мільёна рублёў, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі. Акрамя пакрыцця шкоды, парушальнікі выплачваюць штраф. Найбольшая колькасць парушэнняў выяўлена ў Гомельскай і Віцебскай абласцях, найменшая — у Гродзенскай і Магілёўскай.

Самая буйная партыя незаконна нарыхтаваных навагодніх дрэў канфіскавана ў жанчыны — індывідуальнага прадпрымальніка з Віцебскай вобласці. Яна набыла лес на пні для нарыхтоўкі дзелавой драўніны, але пры гэтым вырашыла зарабіць дадатковыя сродкі на продажы маладняку хвойных дрэў без афармлення адпаведных дакументаў. Рэйдавая група дзяржаўнай лясной аховы Лёзненскага лясгаса заспела работнікаў прадпрымальніка, калі тыя загружалі 158 елак у аўтамабіль для перавозкі на гарадскі рынак для продажу. Жанчыну-прадпрымальніцу прыцягнулі да адказнасці. А навагоднія дрэвы былі накіраваны на рэалізацыю на афіцыйны ёлачны кірмаш.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

Даты | Падзеі | Людзі

**1733** год — 280 гадоў таму нарадзіўся (мястэчка Наваельня, цяпер Дзятлаўскі раён) Антоній Тызенгаўз, палітычны і грамадскі дзеяч ВКЛ, мецэнат. Кіраваў каралеўскімі эканоміямі ў Беларусі і Літве. Па яго ініцыятыве заснаваны Гродзенскія каралеўскія мануфактуры, пабудаваны Гарадзенскія дамы Тызенгаўза, Пастаўскія дамы Тызенгаўза, адкрыты Гродзенскі тэатр Тызенгаўза, кадэцкі корпус, медыцынская школа ў Гродне. Займаўся вырошчваннем мяса-малочных парод жывёл, адным з першых выкарыстаў парнікова-цяплічную сістэму. Ініцыятар першага ў Беларусі перыядычнага выдання «Гродзенскай газеты». Антоній Тызенгаўз быў не толькі буйным фінансістам і адміністратарам, але даволі адукаваным і культурным чалавекам свайго часу. А. Тызенгаўзу былі блізкія і зразумелыя ідэі Асветніцтва. Заснаваўшы дзясяткі мануфактур і навучальных устаноў, ён стварыў і свой тэатр, у які запрашаў балетмайстраў, замежных артыстаў, музыкантаў, спевакоў і харэографаў, а для падрыхтоўкі ўласных артыстаў з прыгонных сялян А. Тызенгаўз стварыў тэатральную школу. У тэатры ён бачыў не крыніцу прыбыткаў, а сродак асветы, інструмент выпраўлення нораваў і ўсталявання роднай мовы. Свае дзеянні ён апраўдваў клопатам пра цывілізацыю тутэйшага краю. Думкі, выказаныя ім пра выхаваўчую ролю тэатра, былі сугучныя палажэнням французскіх асветнікаў, асабліва Д. Дзідро. Каб надаць сваім пачынанням пэўную важкасць, Тызенгаўз вёў перапіску з Ж.-Ж. Русо і прапаноўваў яму пераехаць у Гродна або ў Белавежскую пушчу. Памёр у 1785 годзе, пахаваны ў фамільным склепе ў Жалудоцкім касцёле.



**1845** год — сын уладальніка фабрыкі музычных інструментаў Адольф Сакс, які многія гады не пакідаў спроб удасканаліць бас-кларнет, стварыў новы інструмент — саксафон. Аўтарства Сакса было пацверджана патэнтам, атрыманым ім праз год. Свае першыя поспехі саксафон падзяліў з ваеннымі маршамі. Асаблівую папулярнасць новы інструмент набыў у пачатку XX стагоддзя, калі ў моду ўвайшоў джаз.

**1937** год — нарадзіўся (вёска Порса Вілейскага раёна) Віктар Кліменцьевіч Кухта, беларускі вучоны ў галіне біяхіміі, доктар медыцынскіх навук (1976), прафесар (1979), заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1999). Аўтар прац па пытаннях тэарэтычнай і практычнай біяхіміі.

Было сказана

**Алесь Гарун (1887—1920), паэт, празаік, публіцыст, дзеяч беларускага Адраджэння пачатку XX стагоддзя:**

***«Ты, мой брат, каго зваць беларусам, роднай мовы сваёй не цурайся».***

**Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.**



**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ!**

**Па гарызанталі:** Валторна. Трамбон. Картэж. Каюта. Такса. Код. Старт. Рыза. Акучнік. Эму. Апарт. Каяк. Скачок. Ані. Туніка. Соер. Дах. Дар. Баран. Кулак. Дан. Штык. Сірата. Дзюба. Ірак. Нара. Балеро. Этажэрка.

**Па вертыкалі:** Правано. Саксафон. Труба. Чардаш. Кантон. Акт. Рака. Кіпр. Каска. Казіно. Аорта. Юра. Юкала. Кабара. Трэст. Акат. Актэт. Бас. Туба. Друк. Аліпада. Азія. Канат. Крах. Нагайка.

## АБУЦЦА Ў КАНФІСКАТ МОЖА ЦЭЛАЯ ВЁСКА

У Віцебску супрацоўнікі падатковай інспекцыі канфіскавалі больш як 1,7 тыс. пар абутку агульным коштам 347,4 млн руб., якія з парушэннямі прадаваліся ў краме прыватнага прадпрыемства. Рэалізацыя ажыццяўлялася ў краме без спецыяльных кантрольных (ідэнтыфікацыйных) знакаў. Акрамя таго, было ўстаноўлена парушэнне з боку касіра парадку прыёму грошай пры рэалізацыі тавараў за наяўны разлік: жанчына прыняла 11 млн без выкарыстання касавага апарата.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.23 | 17.12 | 7.49 |
| Віцебск — | 9.20 | 16.55 | 7.35 |
| Магілёў — | 9.14 | 17.02 | 7.48 |
| Гомель — | 9.02 | 17.07 | 8.05 |
| Гродна — | 9.37 | 17.29 | 7.52 |
| Брэст — | 9.30 | 17.37 | 8.07 |

## Месяц

***Маладзік у 21.44. Месяц у сузор'і Казярога.***

## Імяніны

***Пр.*** *Ганны, Варвары, Наталлі, Івана, Марка.*

***К.*** *Ганараты, Марты, Мацільды, Аляксандра, Гілярыя, Фелікса.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Сёння мне пашанцавала: да мяне прыйшло сапраўднае каханне, а жонкі якраз не было дома.**

Самая вялікая памылка ў жанчын: «Ён зменіцца».

Самая вялікая памылка ў мужчын: «Возьмем літр, павінна хапіць».

**Людзі на Новы год дзеляцца на два тыпы: «З надыходзячым!» і «Вас таксама!».**

Я чуў легенду пра аднаго хлопца, які аднойчы здагадаўся, чаму на яго пакрыўдзілася дзяўчына...




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 25.899. Індэкс 63850. Зак. № 210.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 10 студзеня 2013 года.